ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 37 (2294)
9 мая 1968 г. ЧАЦВЕР
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

# НЕ ЗГАСНЕ Ў ВЯКАХ ПОДЗВІГ САВЕЦКАГА НАРОДА Ў СМЯРОТНАЙ БІТВЕ З ФАШЫЗМАМ!

## АБ'ЯДНАНЫ СХОД КАМУНІСТАЎ ТВОРЧЫХ САЮЗАЎ

**7 мая адбыўся аб'яднаны сход камуністаў трох творчых саюзаў — пісьменнікаў, мастакоў і кампазітараў рэспублікі.**

**Сход заслухаў і абмеркаваў даклад загадчыка аддзела культуры ЦК КПБ С. В. Марцэлева аб выніках красавіцкага (1968 г.) Пленума ЦК КПСС і задачах партыйных арганізацый.**

**У спрэчках па дакладу выступілі Р. Шырма — старшыня праўлення Саюза кампазітараў БССР, А. Кулакоўскі — сакратар партыйнай арганізацыі Саюза пісьменнікаў БССР, В. Грамыка — старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР, пісьменнікі Ф. Яфімаў, А. Міронаў, Максім Танк — першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР.**

**Удзельнікі сходу аднагалосна прынялі пастанову, якая ўхваляе рашэнні красавіцкага Пленума ЦК КПСС.**

# СЁННЯ — СВЯТА ПЕРАМОГІ

МІНСК. АБЕЛІСК ПЕРАМОГІ.

Фота Р. КАДЗЕТА.

## ШТО ТАКОЕ НАША ПЕРАМОГА

*Расказ Александрыны Мікалаеўны КАЧАН. Вёска Гаравыя Якубавічы Лагойскага раёна*

ПРАЖЫЛА я на свеце шэсцьдзесят тры гады. Розныя яны былі, гады гэтыя: радасныя і сумныя, шчаслівыя і гаротныя. Самыя цяжкія, самыя гаротныя былі гады вайны.

Як сёння помню тую нядзельную раніцу, калі дакацілася да нашага сяла вестка аб вайне. Не хацелі людзі верыць у тое. Як жа так, думалася, толькі ж, здаецца, на ногі сталі, пачалі жыць па-людску, а тут — вайна? І спадзяваліся: а можа абыдзецца ўсё, разаб'юць нашы таго гітлера адразу ж, не пусцяць на родную зямельку?

Праз два дні сабраліся ўсім сялом на выгане. Мітынг там быў. Выступалі мужчыны, кляліся не пусціць ворага ў родную хату, а мы, бабы, нібы прадчуваючы нядобрае, галосім. Пасля мітынга ўсе мужчыны ў раён пайшлі. З якой хаты чалавек, гаспадар пайшоў, з якой — сын, з якой — зяць, а з якой — і па двое, па трое. Мы, бабы, ведалі, што не на гулянку, на вайну ідуць, а ўсё ж кожная спадзявалася, што вернецца яе чалавек, сын ці брат.

Што было пасля, дык і ўспамінаць страшна. Каб таго вочы ніколі не бачылі і вушы не чулі! Ніводнай жа ночкі спакойнай не было, ніводнага дзянёчка без страху не пражылі. Як сілы ставала, дык і сама не разумею. Мусіць, злосць, вялікая злосць, а яшчэ — трывога за дзяцей сілы давала. А засталася я з шасцю дзецьмі. Старэйшаму чатырнаццаты гадок ішоў, а меншанькаму, Мішу к пачатку вайны толькі тры нядзелькі споўнілася. Пачуеш крыкі: «Немцы!», Мішу і Геню на рукі — ды ў лес. Астатнія самі бягуць за мной. Здаецца, і блізка да лесу, а задыхаешся... Галосіш, бывала, просіш: «Дзеткі, бяжыце, мяне не чакайце! Бяжыце, хавайцеся!» Думаеш: мяне дагоняць, дык такой ужо бяды, а ім жа жыць трэба...

Аднаго разу не паспел! ўцячы. Выскачыла з дзецьмі на двор, а яны ўжо там, карову з хлева выводзяць, мне нешта гергечуць, вінтоўкамі махаюць. Здагадалася: загадваюць збірацца. Ну, думаю, усё, смертачка прыйшла. Выпхнулі мяне з дзецьмі за вароты, пагналі па вуліцы. Многа людзей пазганялі, хто схавацца не паспеў. Пасадзілі ўсіх на машыны і павезлі. Спачатку да Мінска давезлі. Тут Лёня мінуту ўлучыў, саскочыў з машыны і ходу. Цётка ў Мінску жыла, ведаў да яе дарогу, дык да яе і пабег. А нас у Смалявічы завезлі. Жылі ў бараках. А людзей там — з усяго свету. Спалі на нарах, упокат і дарослыя і дзеці. Хто мог што рабіць, на работу ганялі. А карміць, дык амаль не кармілі: баландой нейкай. Дзеці пачалі з голаду заходзіцца. Месяцы са два я там мэнчылася. А пасля добрыя людзі падказалі, памаглі. Уцякай, кажуць, баба, а то і сама загінеш, і дзяцей загубіш. І неяк жа ўцякла. Ішла з дзецьмі дадому, вёскі абмінаючы, каб не наткнуцца дзе на немцаў ці палі цаяў. Каласамі карміліся, пакуль дахаты прыбіліся...

Цяперака і расказаць цяжка, як і сама выжыла і дзяцей уберагла, як з голаду не памерлі. Ні кароўкі, ні свінчаці, бульбіны, солі ў хаце не было. Вайна вайною, а есці ж трэба было. І арала сама, і сеяла. А што суседзі падсобяць, партызаны памогуць. А гэта ж каб спакойна было. А то робіш што на полі і кожную хвілічку прыслухоўваешся, ці не чутно чаго. Бо ведаеш, што вінаватых немчура не шукала, ні старых, ні малых не шкадавала.

От чула па радыё, што ў Хатыні помнік ставяць, што там толькі двое чалавек у вайну ацалела, а ўсіх астатніх разам з хатамі папалілі. А колькі ж такіх вёсак толькі ў нашым раёне. Кожную ночку то там зарава, то там. Во, побач з намі Янушкавічы — Гарэлымі завуцца. Раней жа яны не былі Гарэлымі. Прыскочылі неяк у сяло немцы. На конях. Пайшлі ў пуньку сена браць і ў тым сене кулямёт знайшлі. Дык усіх чысцютка людзей пастралялі. Усіх, хто ў сяле быў, нават тых, хто па якой патрэбе з суседняга сяла прыйшоў. А Янушкавічы спалілі, ніводнай хаты, ніводнай пабудоўкі не пакінулі.

Колькі людцаў пагінула — хто гэта і калі падлічыць! Пэўна ж, мільёны, як па радыё кажуць. Гэта ж нашу вёску ўзяць. Няма, мусіць, ніводнай хаты, у якой бы за вайну ўсе ацалелі. То на фронце хто галаву склаў, то ў партызанах, то нямаведама за што быў расстраляны ці замучаны.

Такая вайна па зямлі пракацілася, якой свет не бачыў. Колькі крыві чалавечай, колькі слёз людскіх пралілося, колькі жыццяў нявінных загублена звярамі фашысцкімі! От успамінаеш усё гэта і думаеш: каб не гэта людское гора, каб не гэтыя людскія пакуты і слёзы, то, мусіць, не вытрываў бы, не выцярпеў бы таго, што і на тваю долю выпала. У агульнай бядзе свая бяда і гора меншымі здаваліся. І не звярэлі людзі, спагадалі і памагалі адзін адчаму ў горы. Як мне, простай бабе, дык здаецца, што гэта і сілу давала. Верылі людзі: як бы там ні было, а ноч гэтая не бясконцай будзе, не вечна немчуры панаваць, чыніць над людзьмі здзекі і гвалты, вернуцца нашы, вызваляць і ўратуюць. І партызаны гэтую веру падтрымлівалі. Даходзілі чуткі: там гарнізон нямецкі разбіты, там у засаду фрыцы трапілі, там паліцаям дыхту далі. Лістоўкі партызаны прыносілі, сходы праводзілі. Разумелі ўсе: не скарыліся людзі, і тут б'юць немца.

Тры гады мы таго дня чакалі. І дачакаліся. Усё сяло выйшла сустракаць — з кветкамі, з пачастункамі. Вынеслі на вуліцу сталы, табурэткі, збанкі з малаком, з квасам, з вадою. Міша мой за вайну падкачаўся крыху, просіць: «Пойдзем, мама, можа татку сустрэнем». Стаю з ім на руках. Нейкі салдат, пажылы ўжо, з машыны саскочыў, падышоў да нас і падаў малому драбок цукру. Узяў яго Міша, у ручках круціць, а што рабіць з ім — не ведае. Я кажу: «Лізні, сынок». Лізнуў ён язычком і засмяяўся. Я і цяперака помню той яго смех, тую яго першую цукерку... А татку ён так і не сустрэў. Праз колькі месяцаў пахаронную я палучыла.

Пасля і таго дня дачакаліся, калі нашы і ў Нямеччыну тую дайшлі, калі мужчыны дамоў пачалі вяртацца. Усе радаваліся і ўсе плакалі. Хто ад радасці, што сын ці муж вярнуўся жывы-здаровы, а хто ад гора пякучага — ужо ніколі не ступіць на парог родны і блізкі чалавек.

А жыць, што ж тут утойваць, не адразу лягчэй стала. Яно ведама: рук няма за што зачапіць, усё павынішчана, папалена, запушчана. І галодныя хадзілі, і абдзёртыя. Але ж хоць на душы спакайней стала, не трэба ноччу калаціцца, трывожыцца... Глядзіш, і пачалі людзі памаленьку абжывацца. Многім дзяржава памагала. Мне во і карову далі, і ў хату ўсялілі, пенсію за мужа прызначылі. Дзеці пачалі падрастаць. Хоць малая падмога (старэйшага дома не было, як пайшоў у армію, у сорак чацвёртым, так там і застаўся служыць), але ж падмога. Сама яшчэ сілу мела. От неяк і выкачаліся ўсе, і выўчыліся, і ў людзі выйшлі.

А цяперака — дык што ж хацець лепшага. Каб здароўе мацнейшае было, дык жыві і не памірай. Пенсію — трыццаць пяць рублёў — палучаю, дзеці не забываюць і не крыўдзяць. Нядаўна было ўсе папрыязджалі. І Лёня, што ў арміі старшыном, і Міша з Валодзем. Яны ў Мінску абое. Адзін на аўтамабільным заводзе робіць, другі — на веласіпедным. Толя тут, дома, у саўгасе трактарыстам. А са мною двое засталося — Шура і Геня. Шура сувязістам, а Геня — на дарозе робіць... Сабраліся ўсе, пагулялі, паспявалі. Я сяджу, слухаю, аб чым яны гавораць, і радуюся. А пасля думаю...

Шмат пагаравалі нашы людзі, дорага заплацілі за перамогу над фашыстамі, але ж не дарэмна гаравалі, жыцці свае аддавалі. Бо каб жа не перамога, то ці радавалася б я за сыноў сваіх, ці мела бы от такую шчаслівую і спакойную старасць? А хіба ж я адна? Кожная матка тое самае скажа. Паглядзіш, як людзі жыць сталі, дык аж уцеха бярэ, аж не верыцца. Во, наша сяло ўзяць. Не пазнаць яго сёння. І магазін, і бальніца, і аптэка, і сталовая ёсць у нас. А школа якая! Двухпавярховая, цагляная. Дома, у сяле, калі ласка табе — і сукенку ці касцюм пашыць можна, чаравікі парамантаваць, гадзіннік. У кожнай хаце — то радыёпрыёмнік, то тэлевізар. А хаты... Да вайны быццам і будаваць так не ўмелі.

І ўсюды ж так, у любой вёсцы. А ў гарадах што робіцца! Я ж даваенны Мінск помню. Дык жа сёння прыедзеш у горад і не верыцца, што і Мінск гэта. Зусім новы горад. А яго ўсё будуюць і будуюць. Я ж як не пабуду ў сыноў доўга, дык прыязджаю і баюся, што заблуджуся, не пагаплю — столькі новых дамоў усюды. А сыны смяюцца, кажуць: от прыедзь, мама, праз год ці два, яшчэ не тое будзе. І пачнуць расказваць, што не адзін Мінск нанова адбудаваўся, што сотні, тысячы гарадоў такіх у нас.

Я ж і сама — слухаю радыё і дзіўлюся: там горад новы пабудавалі, там — завод, там — электрастанцыю. А машын якіх павынадумлялі! Проста не верыцца, што ўсё гэта чалавек можа. І от баныш усё гэта, слухаеш і радуешся: як жыццё наша змянілася за гады, што мінуліся пасля вайны, якімі мы сталі смелымі, моцнымі, шчаслівымі. Быццам памаладзела ўсё навокал: і людзі, і вёскі, і гарады, і сама зямля наша. Ва ўсім гэтым відна наша перамога над цёмнымі фашысцкімі сіламі.

І як жанчына, як маці я кажу: хай ніколі не варочаецца ў наш дом вайна, хай заўсёды будзе ціха на свеце!

## ФЕСТЫВАЛЬ СТАРТУЕ Ў ГОМЕЛІ

4 мая на Гомельшчыне пачаўся фестываль беларускага прафесіянальнага мастацтва, прысвечаны 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі.

Сюды прыехала Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла, Беларускі народны хор, артысты тэатра оперы і балета і іншыя творчыя калектывы і салісты — усяго 700 удзельнікаў. Яны выступяць з святочнымі праграмамі, прысвечанымі юбілею рэспублікі.

Урачыстае адкрыццё фестывалю адбылося ў Гомельскім Палацы культуры чыгуначнікаў.

Вялікую глядзельную залу Палаца запоўнілі працоўныя горада. У глыбіні сцэны на фоне беларускага арнаменту выразна выдзяляюцца малюнкі ліры і галінкі цвітучай яблыні — сімвал гомельскай дэкады фестывалю. Побач словы прывітання яго ўдзельнікам.

З уступным словам на вечары, прысвечаным адкрыццю фестывалю, выступіў сакратар абкома партыі Р. Жданко. Гасцей віталі мастацкі кіраўнік Гомельскага Палаца культуры чыгуначнікаў, народны артыст рэспублікі А. Рыбальчанка, работніца фабрыкі імя 8-га Сакавіка З. Плотнікава, сакратар Гомельскага аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР Л. Гаўрылкін, сакратар абкома камсамола В. Жураўлёў. Са словам у адказ выступіў міністр культуры БССР М. Мінковіч. Ён горача падзякаваў гамяльчанам за сардэчны прыём прадстаўнікоў беларускага мастацтва і аб'явіў фестываль адкрытым.

Затым адбыўся вялікі канцэрт, які пачаўся «Святочнай уверцюрай» Д. Шастаковіча ў выкананні Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра пад кіраўніцтвам заслужанага артыста БССР В. Катаева.

Гамяльчане па заслугах ацанілі майстэрства Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР, бурна апладзіравалі народнай артыстцы СССР Тамары Ніжнікавай, народнаму артысту БССР Віктару Чарнабаеву, заслужанаму артысту БССР Аркадзю Саўчанку, заслужанаму артысту рэспублікі Віктару Вуячычу, эстраднаму рэвю «Львоніха на арбіце».

На працягу дзесяці дзён на Гомельшчыне мяркуецца наладзіць каля 250 канцэртаў.

З вялікімі канцэртамі перад калектывам завода «Гомсельмаш», у калгасах Хойніцкага і Брагінскага раёнаў выступіў Беларускі народны аркестр пад кіраўніцтвам народнага артыста БССР прафесара І. Жыновіча. Цёпла сустрэлі хлебаробы калгаса імя Леніна Гомельскага раёна выступленне Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР Р. Шырмы.

Канцэрты Дзяржаўнага народнага хору (мастацкі кіраўнік народны артыст рэспублікі Г. Цітовіч) адбыліся ў Лельчыцкім і Ельскім раённых дамах культуры. Эстрадная брыгада пад кіраўніцтвам заслужанага артыста рэспублікі Р. Дзідзенкі выступіла з канцэртам у калгасе імя Кірава Рагачоўскага раёна і ў Кармянскім раённым Доме культуры, а эстрадная група з удзелам заслужанага артыста рэспублікі М. Шышкіна — у Нароўлі.

З вялікім канцэртам у Рэчыцкім гарадскім Доме культуры выступілі салісты Беларускага тэатра оперы і балета. У Рагачоўскім раённым Доме культуры паказалі сваё майстэрства артысты эстраднага ансамбля «Арбіта-67» з удзелам дыпламанта Усесаюзнага конкурсу савецкай песні Н Багуслаўскай.

У клубах, палацах і дамах культуры перад працоўнымі вобласці штодзень выступаюць 30 мастацкіх калектываў — удзельнікаў Усебеларускага фестывалю прафесіянальнага мастацтва.

Пасля Гомельшчыны маршруты фестывалю пралягуць па Гродзенскай, Брэсцкай, Магілёўскай і Віцебскай абласцях.

## ПАМЯЦІ СЯБРОЎ-ПІСЬМЕННІКАЎ

Свае першыя кнігі вершаў паэт Мікола Сурначоў не ўбачыў. Ён не дажыў да радаснага Дня Перамогі. Старшы лейтэнант Сурначоў загінуў на полі бою за 8 кіламетраў ад Берліна. Але вершы яго, якія ствараліся ў траншэях над Дняпром, у блінда жах на Каўказе і ў Румыніі, у час прывалаў у Беларусі і Польшчы, у шпіталях, жывуць. Чытачы ўспрымаюць іх як летапіс суровых дзён вайны.

Добраахвотнікам пайшоў на фронт Хвядос Шынклер. Афіцэр загінуў, абараняючы Радзіму ля сцен Сталінграда. Не вярнуліся з палёў бітваў Алесь Жаўрук, Змітрок Астапенка, Леанід Гаўрылаў — усяго на мемарыяльнай дошцы ў Саюзе пісьменнікаў БССР напісаны імёны 22 беларускіх літаратараў.

Учора, 8 мая, напярэдадні свята Перамогі ў клубе Саюза пісьменнікаў БССР адбыўся вечар, прысвечаны памяці пісьменнікаў Савецкай Беларусі, якія аддалі жыццё ў барацьбе за Радзіму ў дні Вялікай Айчыннай вайны. З успамінамі аб загінуўшых таварышах на вечары выступілі беларускія пісьменнікі.

'БЕЛТА'.

## АД КАМІТЭТА ПА ЛЕНІНСКІХ І ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРЭМІЯХ СССР

### У ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ, МАСТАЦТВА І АРХІТЭКТУРЫ ПРЫ САВЕЦЕ МІНІСТРАЎ СССР

**Камітэт па Ленінскіх і Дзяржаўных прэміях СССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры пры Савеце Міністраў СССР прымае работы на атрыманне Ленінскіх прэмій 1969 года.**

**На атрыманне Ленінскіх прэмій могуць вылучацца асабліва выдатныя работы апошніх гадоў у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры, апублікаваныя (надрукаваныя, публічна выкананыя, пабудаваныя) не пазней 15 кастрычніка 1968 года.**

**Прадстаўленне работ адбываецца кіруючымі органамі творчых саюзаў і грамадскіх арганізацый, калегіямі міністэрстваў і дзяржаўных камітэтаў, вучонымі саветамі, навукова-даследчых інстытутаў і вышэйшых навучальных устаноў, выдавецтвамі, рэдкалегіямі газет і часопісаў, сходамі калектываў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый. Вылучэнне работ павінна адбывацца ў абстаноўцы высокай патрабавальнасці да ацэнкі іх значнасці, аб'ектыўнага і аргументаванага абмеркавання кандыдатур і аўтарскіх калектываў.**

**Адначасовае вылучэнне адной і той жа работы на Ленінскую і Дзяржаўную прэмію СССР не дапускаецца.**

**Прыём работ будзе адбывацца да 16 кастрычніка г. г. Па ўсіх пытаннях, звязаных з вылучэннем і афармленнем дакументаў, звяртацца ў Камітэт па Ленінскіх і Дзяржаўных прэміях СССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры па адрасу: Масква, Цэнтр, ГСП-2, Нягалінная вул., 15, тэл. 23-44-67 і 23-19-30.**

## ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

**За плённую работу ў галіне савецкай літаратуры і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Неман» пісьменнік Папоў Георгій Лявонцьевіч узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.**

# БЕССМЯРОТНАЯ СПАДЧЫНА

## КАРЛ МАРКС І ПЫТАННІ ЛІТАРАТУРЫ

**Аляксандр МЯСНІКОЎ,**
**літаратуразнаўца, прафесар**

Толькі паўтара стагоддзя прайшло з таго дня, калі нарадзіўся Маркс, а як змяніўся за гэты час воблік усяго чалавецтва. Нарадзіўся новы, небывалы свет — свет сацыялізма, які праклаў надзейныя магістралі ў будучыню — у камунізм, свет нябачанага росквіту ўсіх здольнасцей чалавека, свет працы, творчасці, мастацтва.

Што мастацтва адлюстроўвае жыццё — аб гэтым ведалі і да Маркса. Але што такое само жыццё, якія законы ім кіруюць, — аб гэтым не ведалі. Адны мысліцелі, як Гегель, стваралі грандыёзныя сістэмы, спрабуючы даказаць, што першаасновы жыцця закладзены недзе па-за чалавецтвам — у Абсалютным Духу. Другія, як Феербах, бачылі гэтыя першаасновы ў самім чалавеку, забываючыся аб тым, што чалавек — істота грамадская. Трэція — вуснамі асветнікаў XVIII стагоддзя — гаварылі аб «грамадскім дагаворы», аб абсалютным розуме, якія нібыта вызначаюць жыццё людзей...

І вось прыйшоў чалавек, якому суджана было абвясціць час нараджэння новай эры. Паводле крылатага выразу Уладзіміра Маякоўскага, «Маркс адкрыў гісторыі законы, пралетарыят паставіў на стырна».

Гісторыя перастала быць загадкай, містычнай сілай. Чалавек здольны пазнаць заканамернасці развіцця гісторыі і выкарыстаць іх для сваіх мэт. Чалавек, паводле Маркса, аказваецца адказным за свой лёс, за лёсы людзей, за развіццё гісторыі.

Марксізм-ленінізм абвастрыў мастацкую зоркасць пісьменніка, паглыбіў яго веданне жыцця, дапамог зрабіць гіганцкі крок углыб праўды.

Праціўнікі марксізма сцвярджаюць, што марксісты нібыта заняты толькі пытаннямі эканомікі і палітыкі, што яны не бачаць спецыфікі мастацтва. Гэта няпраўда. Маркс ясна гаварыў аб адрозненні навуковага і мастацкага пазнання свету. «Цэлае, — гаварыў Маркс, — як яно ўяўляецца ў галаве ў якасці мыслімага цэлага, ёсць прадукт мыслячай галавы, якая асвойвае свет выключна ёй уласцівым спосабам — спосабам, які адрозніваецца ад мастацкага, рэлігійнага, практычна духоўнага асваення гэтага свету». Як вядома, Маркс падкрэсліваў і арганічную сувязь твораў мастацтва з іншымі формамі мастацкай свядомасці, сувязь складаную — сувязь, якая патрабуе кожны раз спецыяльнага канкрэтнага разгляду, і адносную самастойнасць мастацтва. Маркс нават спецыяльна падкрэсліваў няроўнамернасць эканамічнага, гістарычнага і мастацкага развіцця грамадства, гаварыў, што адносна няцяжка зразумець і растлумачыць залежнасць некаторых твораў мастацтва ад пэўных форм грамадскага развіцця пэўнай эпохі, значна цяжэй рашыць другую задачу — растлумачыць, чаму асобныя творы, створаныя нават у аддаленую эпоху і пазначаныя яе асаблівасцямі, працягваюць прыносіць нам мастацкую асалоду. Не марксісты, а іх праціўнікі спрашчаюць гэту складаную праблему. Як вядома, прадстаўнікі самых розных школ фармалістычнага літаратуразнаўства вось ужо болей як паўстагоддзя сцвярджаюць, што твор мастацтва трэба разглядаць толькі як унутраную мастацкую структуру, што даследчыка не павінны цікавіць ні праблемы генезіса, ні праблемы функцый мастацкага твора, што ён важны сам па сабе. Паўстае законнае пытанне: а што дае для разумення мастацтва гэта, карыстаючыся выразам Анры Барбюса, сістэма «скарочаных сувязей»? Ці не збядняе яна эстэтычны аналіз?

Як вядома, Маркс не напісаў гісторыі сусветнай літаратуры. Аднак тэорыя Маркса, яго вучэнне аб грамадска-палітычных фармацыях, аб асаблівасцях развіцця розных форм грамадскай свядомасці, яго бліскучыя заўвагі аб літаратуры і мастацтве і ацэнкі пісьменнікаў розных эпох і народаў, пачынаючы ад Гамера і канчаючы плеядай рэалістаў XIX стагоддзя, даюць прагрэсіўным даследчыкам надзейны арыенцір, каб стварыць навукова выверaную гісторыю сусветнай літаратуры.

Для разумення літаратурнага твора і гісторыі літаратуры важнае значэнне мае правільнае рашэнне праблемы аб'ектыўных і суб'ектыўных пачаткаў у мастацкай творчасці. Праціўнікі марксізма не ў стане рашыць гэтае пытанне дыялектычна: яны абсалютызуюць або аб'ектыўны або суб'ектыўны пачатак. Так, напрыклад, прыхільнікі натуралістычных эстэтычных сістэм лічаць, што галоўная задача мастака зводзіцца да як мага больш дакладнага ўзнаўлення рэчаіснасці, голас мастака пры гэтым павінен гучаць прыглушана і нават зусім не выяўляць сябе. Прыхільнікі ўсялякіх суб'ектывісцкіх эстэтычных сістэм, наадварот, лічаць, што прадмет паказу не адыгрывае ў мастацтве рашаючай ролі, больш таго, некаторыя з іх самім прадметам паказу лічаць не жыццё, якое адлюстроўваецца, а тыя ўражанні ад яго, якія склаліся ў ду-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

Канстанцыя БУЙЛА

## ВЯРТАННЕ САЛДАТА

Цягнік засвістаў і залязгаў на стыках,
І ўсіх ліхтароў адыходзяць агні...
Дамоў! Перамога нам шчасцем вялікім
Сагрэла, абвесніла нашыя дні.
Радзіма! Ты любай была мне да болю,
Радзіма! Цудоўны мой яблынны цвет...

Убачу лясы я, убачу я поле,
Дзе ўціснуты першы дзіцячы мой след.
Убачу народ — непахісны ў змаганні,
І роднага неба блакітны прастор,
І ясныя зоры — вясной, на світанні,
І ціхія гладзі люстраных азёр.
Мы едзем дамоў! Не у госці, да часу,
Мы едзем узняць, аднавіць гарады,
Засеяць палі зруйнаваных калгасаў,
Вайны ненавісныя знішчыць сляды.
Засеем палі і сады зноў насадзім,
Радзіма, ты ўстанеш у новай красе!
Табе мы і ў працы чіколі не здрадзім,
Навекі з табою мы звязаны ўсе!

Фатаграфія НАГАДАЛА...

## АДНЫМ АСЕННІМ ДНЁМ

Есць у Мацвея Бланта-ра харошая песня «Пушки молчат дальнобойные». Расказваецца ў песні, што даўно на зямлі нашай усталявалася мірная цішыня, а ў снах ветэранаў вайны ўсё яшчэ страляюць гарматы...

Так, страляюць... Столькі вады сплыло, а ў памяці—ды што ў памяці! — у сэрцы жыве ўсё, што давялося перажыць, пераадолець у тую грозную векапомную пару.

А ў Свята Перамогі ваеннае ліхалецце ўспамінаецца з асаблівым хваляваннем. Я бяру альбом, і ў каторы раз пераглядаю старыя фотакарткі. Зноў паўстаюць перад вачыма цяжкія франтавыя дарогі, баявыя сябры. Зноў, бы нанава, перажываю падзеі, удзельнікам якіх давялося быць...

Пагодлівым асеннім днём да нас на фронт прыехаў Міхаіл Іванавіч Калінін. Суправаджалі яго А. Ф. Горкін і намеснік наркома абароны генерал-лейтэнант А. Д. Румянцаў.

Памятаю, для сустрэчы «усесаюзнага старасты» (было гэта ў недалёкім франтавым тыле) былі пастроены ў лінію ўзводных калон афіцэрскія курсы 33-й арміі, якія складаліся ў асноўным з удзельнікаў Маскоўскай бітвы. Правы фланг узначальваў узвод дзяўчат-снайпераў і разведчыц — —кандыдатак на афіцэрскае званне.

Абышоўшы строй, М. І. Калінін, А. Ф. Горкін, генерал А. Д. Румянцаў, дывізіённы камісар, які прыехаў з імі (прозвішча яго не памятаю) і аўтар гэтых радкоў падняліся на трыбуну. (Гэты момант вы бачыце на здымку).

Генерал Румянцаў сказаў невялікую прамову, і міма трыбуны прайшлі ўрачыстым маршам курсанцкія роты. Першымі крочылі дзяўчаты.

— Хто яны? — пацікавіўся Міхаіл Іванавіч. І, даведаўшыся, што гэта былыя снайперы і вайсковыя разведчыцы, сказаў:—Гераіні...

Потым я правёў М. І. Калініна ў маленькі пакой, падрыхтаваны для яго адпачынку. Я хацеў быў пайсці, але Міхаіл Іванавіч мяне затрымаў, прапанаваў сесці. Сам, стомлены, таксама сеў.

— Ногі ацякаюць, — нічога не зробіш, гады!— паківаў галавой Міхаіл Іванавіч. — Расказвайце, як вы тут жывяце? Які настрой у курсантаў? У чым маеце патрэбу?

Пацікавіўся, як жывуць дзяўчаты, ці добра забяспечваюцца абмундзіраваннем.

Даведаўшыся, што я нядаўна вярнуўся з Карманава, якое толькі-толькі было вызвалена нашымі войскамі, пачаў пытацца, як штурмавалі горад. Хто першы прарваўся да яго і чаму не пайшлі на Сычоўку і Гжацк.

— Да канца аперацыі ў дывізіях засталося вельмі мала пяхоты,—адказаў я.

— Вось бачыце, як трэба беражліва ставіцца да людзей...

Прыкладна, праз гадзіну запрасілі гасцей на сяброўскі абед, у час якога Міхаіл Іванавіч абвясціў тост за ратныя справы Заходняга фронту, за поспехі курсантаў —будучых камандзіраў.

А вось ужо і праводзіны. Адна за адной міма строю курсантаў праязджаюць машыны і хаваюцца за паваротам. Зноў напружаныя франтавыя будні.

Ішоў верасень 1942 года...

Мікалай АЛЯКСЕЕЎ,
пісьменнік, генерал-маёр інжынерных войск у адстаўцы.

ДЗЕ БЫЛІ АКОПЫ

## Прыеду сюды яшчэ...

Лукомльская ДРЭС... Адна з буйнейшых новабудоўляў роднай Беларусі. Не дзіва, што сюды, дзе адмыслова спалучаюцца маляўнічыя краявіды над Лукомльскім возерам са створаным рукамі чалавечымі індустрыяльным пейзажам, часта прыязджаюць мастакі з Мінска, Віцебска і іншых гарадоў рэспублікі.

Першы раз я пабываў тут амаль два гады назад (мае замалёўкі будоўлі друкаваліся ў «Літаратуры і мастацтве» 9 жніўня 1966 года). Сёлета пацягнула сюды зноў...

Пад'язджаючы да будоўлі познім веснавым вечарам, я ўбачыў мора агнёў. Пражэктары літаральна залівалі святлом будаўнічыя пляцоўкі. На фоне святла рэзка вырысоўваліся контуры будучых цэхаў галоўнага корпуса. Будоўля разраслася ўшыркі і паднялася высока ў неба... Чалавек тут выглядае, як пясчынка. Але ўсё гэта зроблена яго рукамі, яго натхненнем.

На наступны дзень з самай раніцы я ўзяўся за паперу і аловак — рабіў замалёўкі па першаму ўражанню, адну за адной, на хаду шукаючы кампазіцыю, выразныя акцэнты...

Цяпер падзея на будоўлі — мантаж галоўнага корпуса ДРЭС — тут працуюць магутныя краны. Ну, як не захапіцца работай мантажнікаў — гэтых смельчакоў, якія на вышыні шасці-сямі павярховага дома, манцёруючы шматтонныя блокі, ходзяць па адкрытых фермах, як па асфальце... Калі я маляваў галоўны корпус, да мяне падышоў брыгадзір мантажнікаў Панчук. «Вось глядзіце, — сказаў ён, — там, наверсе, вядуць мантаж мае лепшыя людзі — Папкоў, Свіналупаў, Яжоў. Адважныя хлопцы і — майстры!»

Паглядзеў я на будоўлю і з вышыні. Больш пяці мінут падымаў мяне з будзўнікамі ліфт на вяршыню кладкі жалезабетоннай дымавой трубы. Там, на вяршыні кладкі, я бачыў, як працавалі вопытнейшыя трубаклады. Між іншым, яны ўдзельнічалі ў будаўніцтве славутай Астанкінскай вежы тэлебачання.

З вышыні панарама будоўлі нагадвала архітэктурны макет. Як жукі, рухаліся па зямлі аўтамашыны, бульдозеры. Лукомльскае возера блішчэла пад промнямі веснавога сонца — толькі земснарад чарнеў, выгінаючыся змейкай па вадзе. Вароны і галубы лёталі далёка ўнізе. А побач — у скрэпах пакрыцця трубы гудзеў вецер, і мне здалося, што труба пагойдваецца...

Дарэчы, калі зайшла ўжо гаворка пра возера, я рады паведаміць усім, што, нягледзячы на блізкасць да прамысловага прадпрыемства, вада яго застанецца чыстай — сцёкавыя воды па трубах выводзяцца далёка ад возера і горада ў спецыяльныя бетонныя зборнікі.

Зробленыя на будоўлі малюнкі я паказаў старшаму інжынеру дырэкцыі ДРЭС Георгію Кірылавічу Якіменка. Праглядзеўшы іх, інжынер сказаў: «Прыязджайце да нас улетку — пачнём мантаж катла з дапамогаю маставых кранаў — вельмі эфектныя малюнкі могуць атрымацца...»

Я абавязкова прыеду сюды яшчэ. Хочацца зрабіць новыя замалёўкі і ў пасёлку з пяціпавярховымі жылымі дамамі (яго назвалі Нова-Лукомль), і ў горадзе — там, дзе клуб, кінатэатр, дзіцячы сад, і на самой будоўлі, дзе ў мяне за час маіх паездак стала многа сяброў.

Уладзімір САКАЛОЎ,
мастак.

Лукомль — Мінск.

Лукомльская ДРЭС. Агульны выгляд.

Брыгада ізаліроўшчыкаў.



Мантаж бакаў для мазута.



Галоўны корпус ДРЭС.

Будуюцца кабельныя тунелі.

Максім ЛУЖАНІН

## З ДАЎНЯЙ ЗАПІСНОЙ КНІЖКІ

Гэтыя вершы, што захаваліся ў старых блакнотах паэта-франтавіка, выразна даносяць подых свайго часу—у іх і мужнасць, і боль, і смутак салдата па мірнай працы. Есць у іх і пазіт, які добра адчувае свой абавязак перад нашчадкамі: хто, акрамя нас, удзельнікаў Айчыннай вайны, пакіне праўдзівае сведчанне народнага гераізму і народных пакут?

Некаторыя з гэтых вершаў напісаны адразу пасля Перамогі — салдат-пераможца, яшчэ не паспеўшы сцерці з твару след парахавога дыму, задумваецца над лёсам міру: які ён будзе?

■ ■ ■

Зноў да рання ляцяць і бамбяць,
З цішынёй развітаўся зацішак.
І калі тыя вершы пісаць,
А за нас іх ніхто не напіша.

1942.

### СМЕРЦЬ КАМІСАРА

Дзень на ржышчы засумаваў,
Як дзіцёнак на рукі горнецца.
Гаварыць я паспрабаваў —
Не гаворыцца.

Аблятае раса
На дацвіўшыя кветкі.
Пазаўчора наш камісар
Не вярнуўся з разведкі.

На ўзрунелай раллі
Мы знайшлі
Пасінелае
Цела...
Пазналі...

Пры стэповай дарозе
У бяды на парозе
Камісара хавалі.

Не дайшоў да краіны ў дом
І не ўчуе ў бязвокным зрубе,
Як калышацца пад дажджом
Жыта Случчыны.
Нашай.
Любай.

1942.

### ТРЭЦЯЯ ВЯСНА

Хутка вясна расцвіце на радзіме,
Як пад вянец прыбяруцца сады,
З морам зраўняюцца рэкі свімі
Хвалямі сіняй вады.

Але які б ні ўзыходзіў прыгожы,
Як ні звінеў бы вясёлкамі дзень,
Цяжка нам з берагу вольнага Сожа
На паярэмлены Нёман глядзець.

Там, узнікаючы з хмарнае ночы,
Тонкі і кволы наземіцца гук:
Кліча зямля нас, пасплакваўшы вочы,
Догляду прагне і дбайлівых рук.

Заўтра за волю, за лёс чалавечы
Самы астатні развяжацца бой —
І супадуць яны—дні нашай стрэчы
З нашае ростані трэцяй вясной.

Там, дзе жанчыны зямлю адмыкалі
Звонкай вяснянкай, ключамі зары,
Выблісне сонца, і ўдараць смыкамі
Па усхвалёваных нівах вятры.

Зразу адчуеш, чаму зазіхцела,
Зводдаля ўчуеш ты крокі сыноў.
Стане нядзеляю той панядзелак,
Раннем якога мы прыдзем дамоў.

1944.

### САПЁР

Ставіць мінныя пасткі набітая
толам Нямеччына,
Злоска маняць — Здаёмся! —
з гарышчаў сцягі —
на кіях.
«Эх, рвануць бы гняздо,
атлусцеўшае на чалавечыне,
Звезці зброю ў варонку, а зверху
заліць акіян.
Больш не вылезлі б войны...»
Рачупка булькоча на ростанях...
І мякчэе сапёр:
«Не адно ж тут жыве груганнё».
Бачыць ён: на траве
Спіць, раскідаўшы ручкі,
светлавалосае
Хлапчанё.

Мусіць, ногі малога
І доўга і многа
Хадзілі,
Што ні выбухаў рокат,
Ні родныя крокі
Яго не ўзбудзілі.

Мо яно
Сястрыно,
Можа сябра, а можа суседа!
Шмат замучыў палон, заняволіў
нярodны прасцяг.
Засталося адно,
Не ўсачыла бацькоўскага следу,—
Спіць дзіця.

Ён хутчэй плашчпалатку з плячэй
узмакрэлых скідае,
Накрывае малое, сядае курнуць.
— Сёння, — шэпча, — дарую,
Нагода такая:
Хлопец добра заснуў...
А другі раз, дальбог жа, рвану!

15. IV. 45.

■ ■ ■

Паўтыдня цягнуўся састаў
да Берліна,
Вагоны без труб, без аконнага
шкла.
Я ехаў і думаў: а што за краіна,
З якой заварушня на свеце
пайшла!

Казалі, цірольцы іграюць
на флейтах,
На кожнай сцяне пастушкі —
акварэль...
А вось падкруціўся кірпаты
яфрэйтар,
Па бубну ім даў, і замоўкла
свірэль.

Усе сантыменты, усе пастаралі
Трымалі, відаць, для адману
вачэй.
Ліслівыя ўсмешкі яны пасціралі,
Запал ваяўніча наўкол засквірчэў.

Сустрэлі ваяк мы і ахападзілі,
Ад Волгі на Одэр — не жартачкі
шлях!
Ды вось жа — з руін выпаўзаюць,
са шчылін,
Яшчэ не адмыўшы крыві з апранах.

Ізноў завываюць ваяцкія дудкі, —
З пружынай катрынка, надоўга
завод.
Падэшвы свярбяць у заморскім
абутку,
Малойчыкі мараць аб маршы
на ўсход.

А чуюць, што больш не таптаць
ім жывое,
А знаюць — ужо не падняць
галавы,
І ціхнуць, як толькі зірне на іх
воін,
Каменны мой друг, нежывы
вартавы.

25. IV.46.

### РАЗМОВА ВАЧМІ

Што вы, фройлен, на мяне
Гэтак скосу паглядзелі,
Нібыта сказаць хацелі —
— Хоць бы згінуў на вайне!

Гінуў, гінуў, а жывы
І сюды вятры данеслі,
Вось хаджу па вашым месце,
Узняўшы ветразь галавы.

І не клічу на адказ,
А яшчэ кармлю вас хлебам.
Не ўсміхайцеся, не трэба,
Для размовы позні час.

18.IV.46. Берлін.

### АПОШНІЯ ДНІ Ў ВОЙСКУ

Да бяды мы ўсе вайной
прывучаны,
Можна — з'еш, а нельга — папасці.
Да душы, страшэнна надакучыла
Мне адно ў вандроўніцкім жыцці.

Паглядзіш на хлопцаў —
здаравенныя!
Кельні дай, пастаў нас за плугі,—
Выкласці будыніны адменныя,
Узвярнуць палеткі мы маглі б.

Ныюць рукі, з працаю разлучаны,
Вочы просяць: дай зірнуць
на дом...
Ціха, хлопцы! Вернемся
на Случчыну,
Вось тады дарвёмся, пааром.

Май. 1944.

# БЕССМЯРОТНАЯ СПАДЧЫНА

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.]

шы мастака. У такіх выпадках чытач чуе голас мастака і не чуе голасу прадмета, як яго перастаў чуць герой апавядання Бальзака «Невядомы шэдэўр», апавядання, якое высока ціў Маркс.

Многія сучасныя буржуазныя тэарэтыкі мастацтва з асаблівай рашучасцю рэкамендуюць мастакам не прыслухоўвацца да голасу розуму, які нібыта спрашчае складаныя з'явы жыцця, а спусціцца ў сферу падсвядомага і нават ніжэй — за парог падсвядомага, дзе прыхільнікі, напрыклад, «новага рамана» шукаюць разгадак усёй складанасці жыцця, а прыхільнікі Юнга — нават пераклічку з архатыпамі, якія створаны тысячы гадоў назад і знаходзяцца недзе ў нетрах падсвядомых сфер сучаснага чалавека.

Маркс выступаў як супраць бясстраснага аб'ектывізму, так і супраць нястрымнага суб'ектывізму. Нават у самых ранніх творах ён заклікаў літаратараў прыслухоўвацца да мовы «самога прадмета, выяўляць своеасаблівасць яго сутнасці» і ў той жа час памятаць і аб суб'ектыўным пачатку, аб тым, што адзін і той жа прадмет па-рознаму пераламляецца ў розных індывідах і ператварае розныя свае бакі ў розныя духоўныя характары,—гэта значыць, не забываць аб складаным адзінстве аб'ектыўных і суб'ектыўных пачаткаў у мастацтве. Не толькі прадмет адлюстравання — рэальнае жыццё, але нават і матэрыял, якім карыстаецца мастак пры стварэнні твораў мастацтва, мае для яго вялікае значэнне. «...Фізічныя ўласцівасці фарбаў і мармуру, — пісаў Маркс у канцы 50-х гадоў мінулага стагоддзя, — не знаходзяцца недзе па-за сферай жывапісу і скульптуры».

Шматлікія ацэнкі Марксам мастацкіх твораў класікаў сведчаць аб тым, як высока ён ціў пазнавальную функцыю твораў мастацтва. У гэтым святле здаецца непераканаўчай спроба некаторых замежных крытыкаў даказаць, што сапраўдны Маркс — гэта Маркс раннята перыяду, калі ён быццам бы ішоў за Фіхтэ і Шэлінгам і абараняў суб'ектывісцкія тэорыі мастацтва.

Маркс змагаўся з суб'ектывісцкай эстэтыкай, але заўсёды падкрэсліваў аб'ектыўную ролю мастака ў сацыяльнай барацьбе. Маркс быў страсным і непрымірымым барацьбітом.

Адна з сучасніц Маркса прыгадвае такі характэрны факт. Некаторыя сябры Маркса лічылі, што ён падобны на Зеўса з Атрыколі: у яго такая ж самая магутная галава з цэлай капой кучаравых валасоў, характэрны лоб са складкай мысліцеля, уладны і добры выраз твару. Нехта з сяброў сказаў, што класічныя багі — сімвал вечнага спакою, бясстрасныя. «Надварот,—запярэчыў Маркс,— у іх вечная страсць, пазбаўленая трывогі». Гэты геній, які лічыў сваім любімым дэвізам «усе за аднаго, адзін за ўсіх», абараняў баявое, натхнёнае перадавымі ідэямі часу, мы б сказалі цяпер, партыйнае мастацтва. Можна спрачацца аб тым, якім спосабам выражаецца гэта ідэйнасць. Класікі марксізма лічылі, што лепш, калі ў творы не чуваць прамога голасу аўтара, што ўся сістэма вобразаў павінна раскрываць яго ідэю, што асобны герой не павінен быць рупарам ідэй аўтара, што мастак павінен больш шэкспірызаваць, чым шылерызаваць. Справа не ў гэтым.

Прынцыпова важнае значэнне мае марксаў папрок Ласалю ў тым, што ў сваім творы Ласаль ставіць лютэранска-рыцарскую апазіцыю пануючаму рэжыму вышэй за плябейска-мюнцэраўскую. Гэта — пытанне аб пазіцыі мастака ў грамадскай барацьбе. Калі ўважліва прачытаць усе працы Маркса па пытаннях мастацтва, то лёгка заўважыць, што Маркс змагаўся за такое мастацтва, якое паказвала б рашаючую сілу народных мас у гістарычных падзеях, якое было б узброена перадавымі ідэямі свайго часу.

Які ж лёс мастацтва ў гісторыі чалавецтва? Гэта вялікая праблема непасрэдна звязана з пытаннем аб лёсе асобы.

Як вядома, Гегель, можа самы магутны розум буржуазнага свету, гаварыў, што ў будучым іншыя формы грамадскай свядомасці адсунуць мастацтва на задні план. Маркс жа адзначаў, што капіталістычная вытворчасць варожая асобным галінам духоўнай дзейнасці, напрыклад, мастацтву і паэзіі, але рабіў адсюль інакшыя, прама супрацьлеглыя вывады.

Прыватная ўласнасць, буржуазныя формы адносін нівеліруюць людзей, пазбаўляюць іх індывідуальнасці. Сапраўдная індывідуальнасць вырастае толькі ў працэсах барацьбы з асновамі капіталістычнага грамадства. «...Развіццё індывіда, — чытаем мы ў «Нямецкай ідэалогіі», — абумоўлена развіццём усіх іншых індывідаў, з якімі ён знаходзіцца ў прамых ці ўскосных зносінах... Гісторыя асобнага індывіда зусім не можа быць адарвана ад гісторыі папярэдніх ці сучасных яму індывідаў, а вызначаецца ёю».

Што змагла сучасная буржуазная думка супрацьпаставіць гэтаму тэзісу Маркса? Якой трагічна змрочнай выглядае ў гэтым святле, напрыклад, тэорыя сучасных экзістэнцыялістаў, якія ставяць у цэнтр светабудовы адзінокую асобу, адказную толькі перад самою сабой за свой лёс, варожую ўсім «іншым», якія нібыта пасягаюць на яе індывідуальную непаўторнасць, асобу, якая раскрываецца поўнасцю толькі ў «пагранічных сітуацыях» страху, смерці, жаху, смяротнай хваробы. Змрочным холадам нясе ад такіх тэорый. Яны ўяўляюцца адступленнем ад тых вышынь, якія ўжо заваявала перадавая думка чалавецтва.

У нашых спрэчках аб канцэпцыі асобы, аб свабодзе творчасці, аб адзінстве светапогляду, разнастайнасці мастацкіх рашэнняў мы недастаткова папулярызуем вопыт нашых настаўнікаў. Мне хочацца нагадаць адну старонку з успамінаў Вільгельма Лібкнехта аб Марксе. Лібкнехт сведчыць, што Маркс належаў да буйнейшых майстроў нямецкай прозы, што ён мае велізарныя заслугі ў развіцці нямецкай мовы. Лібкнехт гаворыць, што Маркс не ведаў іншага культу, апрача культу ісціны, што ён арганічна быў нездольны да прытворства і крывадушнасці, што «ён заўсёды быў самім сабою як у сваіх творах, так і ў сваім жыцці». Але Маркс быў разнабаковай, шматграннай асобай, гэта наклала адбітак і на стыль яго твораў. «Маркс — тварэц «Капіталу», — падкрэслівае Лібкнехт, — Маркс — аўтар «Васемнаццатага брумера» і Маркс — стваральнік «Пана Фогта» — тры розныя Марксы, і ўсё ж пры ўсёй розніцы гэта адзін Маркс. У гэтай трактасці ўсё-такі ёсць адзінства — адзінства вялікай асобы, якая розна праяўляе сябе ў розных галінах». У працы Маркса «Васемнаццатага брумера», напрыклад, Лібкнехт знаходзіць гнеўную суровасць Тацыта, знішчальны жарт Ювенала, свяшчэнны гнеў Дантэ, і, перш за ўсё, непаўторны почырк самога Маркса.

Адрозненне сацыялістычнага грамадства ад капіталістычнага, вучыў Маркс, заключаецца ў тым, што пры капіталізме адбываецца выключная канцэнтрацыя мастацкіх талентаў у некаторых асобах і вынішчэнне яго ў шырокіх масах. Сацыялізм заклікаць абуджаць эстэтычныя здольнасці масы і развіваць іх. Таму, — падкрэслівалі заснавальнікі навуковага камунізма, «кожны, у кім сядзіць Рафаэль, павінен мець магчымасць бесперашкодна развівацца». Такія ўмовы ствараюцца ў сацыялістычных краінах, і мы ўсе зацікаўлены ў тым, каб у нас было «шмат паэтаў добрых і розных» ва ўсіх галінах мастацкай творчасці.

Эстэтычныя погляды Маркса і Энгельса атрымалі далейшае развіццё ў працах Леніна. Усе прагрэсіўныя вучоныя свету ў сваіх даследаваннях апіраюцца на тыя адкрыцці, якія зрабілі заснавальнікі марксізма-ленінізма, на вопыт развіцця сацыялізма, на новыя з'явы ў сусветным мастацтве. Сіла нашага літаратуразнаўства ў тым, што яно раскрывае заканамернасці мастацтва мінулага і сучаснага, што яно звернута ў будучыню, насустрач новым адкрыццям, новым здзяйсненням.

«Сучасны этап гістарычнага развіцця, — гаворыцца ў пастанове красавіцкага Пленума ЦК КПСС, — характарызуецца рэзкім абвастрэннем ідэалагічнай барацьбы паміж капіталізмам і сацыялізмам». Ідэолагі імперыялізму ўжо не вераць у сілу ўласных дактрын. Яны спрабуюць падарваць сілы прагрэсу знутры. Ім дапамагаюць права-рэвізіяністкія рэфарматары і левыя дробнабуржуазныя аматары ўсялякіх скачкоў і авантур. Ва ўсіх сферах ідэалогіі, у тым ліку і ў літаратуры і мастацтве, ідзе жорсткая барацьба.

Аднак сам наш час паказвае жыватворную сілу ідэй Маркса, Энгельса і Леніна ў новых умовах ідэалагічнай барацьбы.

Мы ўсе памятаем прарочыя словы Леніна: «За нашы погляды заступаецца сама гісторыя, заступаецца на кожным кроку рэчаіснасці». Марксізм не абараняецца, марксізм — у наступленні.

# ПЕРАЧЫТАЙЦЕ ЯГО ЗНОЎ

## ЯНКУ МАЎРУ — 85 ГАДОЎ

**Паслязаўтра спаўняецца 85 гадоў старэйшаму беларускаму пісьменніку, аднаму з заснавальнікаў нашай дзіцячай літаратуры Янку Маўру. Праўленне Саюза пісьменнікаў рэспублікі ў прывітальным адрасе юбіляру піша:**

**«ДАРАГІ ІВАН МІХАЙЛАВІЧ!**

**Ад усяго сэрца вітаем і віншуем Вас, старэйшага сярод старэйшых у беларускай літаратуры, з 85-годдзем з дня Вашага нараджэння.**

**Вы паплечнік незабыўных Янкі Купалы і Якуба Коласа і разам з тым наш выдатны, вельмі паважаны сучаснік. Ваша роля ў развіцці беларускай літаратуры, дзіцячай, у прыватнасці, агульнавядомая. Вашы кнігі трывала ўвайшлі ў фонд нацыянальнай класікі.**

**Нам, Вашым маладзейшым таварышам па літаратурнай працы, радасна бачыць Вас, слухаць Вас, ведаць, што Вы разам з намі. І мы горача жадаем, каб яшчэ доўга-доўга Вас не пакідалі здароўе, бадзёрасць, добры настрой.**

**Моцна абнімаем Вас».**

**Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва», далучаючыся да гэтага прывітання, таксама сардэчна вітае і віншуе дарагога і паважанага Івана Міхайлавіча з днём нараджэння і шчыра жадае яму ўсяго самага найлепшага.**

Нядаўна на мастацкай выстаўцы мне давялося ўбачыць новы партрэт Янкі Маўра. Партрэт выстаўляўся ўпершыню, і таму хацелася разгледзець яго больш уважліва. Мабыць, многія ведаюць гэтае пачуццё: глядзіш на партрэт знаёмага чалавека і нечакана адкрываеш у ім, дзякуючы мастаку, новыя рысы. Але на гэты раз такой радасці пазнавання не было. Мастак напісаў нейкага заспакоенага і задаволенага чалавека, але толькі не Янку Маўра. Заспакоены чалавек — гэта амаль раўнадушны, і, значыць, зусім не падобны да аўтара «Палескіх рабінзонаў» і «Сына вады». І вельмі шкада, што, можа, некаторыя наведвальнікі выстаўкі, калі яны незнаёмыя з нашым цудоўным дзіцячым пісьменнікам, паверацъ, што такі і на самай справе Янка Маўр — сур'ёзны, салідны, афіцыйны.

А ён жа зусім не такі. Ён — мудры і насмешлівы, жывы, рухавы і па-маладому дапытлівы.

Штогод дзесяткі атрадаў юных падарожнікаў прыходзяць у Мінск з самых далёкіх куткоў Беларусі, прыходзяць з надзеяй убачыць Янку Маўра, пабываць у яго ў гасцях. І калі толькі дзядуля Янка не ў ад'ездзе, сустрэчы адбываюцца і, само сабою, становяцца потым прадметам асаблівага гонару і бясконцых расказаў дома.

Вельмі многія ў Беларусі ведаюць, што гаварыць з Іванам Міхайлавічам — вялікае задавальненне. Ён умее жартаваць дасціпна і ярка, умее ахарактарызаваць з'яву дакладна і вобразна. Яго цікавіць усё — рэчы, падзеі, людзі. Перш за ўсё людзі — хто яны, які іх унутраны свет, чаму яны дзейнічаюць так, а не інакш.

Нам, супрацоўнікам дзіцячых выданняў, асабліва пашанцавала: мы не раз маглі бачыць Івана Міхайлавіча разам з дзецьмі. І вось аказвалася, што ў вялізнай дзіцячай арміі ёсць у яго «любімчыкі». Гэта — рамантыкі, летуценнікі. Гэта тыя «цяжкія» для выхавацеляў хлапчукі, якія ў пошуках прыгод могуць уцячы з дому, якіх ловяць на далёкіх станцыях і вяртаюць у родную школу. Янка Маўр разумее іх неспакойную душу, прагу прыгод і подзвігаў і стараецца яе спатоліць у сваіх кнігах.

Янку Маўру — восемдзесят пяць гадоў. Многія з яго колішніх чытачоў — ужо даўно не дзеці. І хочацца спытаць у іх сёння: «А ці даўно вы чыталі Янку Маўра?».

Гэтае пытанне недарэчы было б задаваць дзецям. «Учора, сёння, пазаўчора», — адкажуць яны, таму што кожны дзень дзесяткі кніжак пісьменніка з бібліятэчных паліц трапляюць у дзіцячыя рукі. А дарослыя — ці даўно вы чыталі Я. Маўра? Шкада, калі ад часоў дзяцінства вы не перагортвалі гэтых старонак. Вы ж памятаеце, мабыць, тое радаснае пачуццё новага, шчасце адкрыцця, якое прыносілі яго кнігі.

Цяпер зноў возьміце любы томік, раскрыйце наўздагад. Запэўняю вас, што гэта будзе чароўнае падарожжа ў цудоўную пару жыцця, у краіну дзяцінства.

...«Тым часам зусім стала цёмна. У гэтых месцах ноч надыходзіць адразу, раптам. Аднак жа папуасы не мерыліся ісці спаць. Яны зноў сталі рыхтаваць свае лодкі.

І мора загарэлася! Ад кожнага руху лодкі, асабліва вясла, вада запальвалася, бруілася бледным полымем. Здавалася, што ўсе лодкі плывуць у агні, а ў некалькіх кроках некранутая вада здавалася яшчэ чарнейшай».

Памятаеце? Можа менавіта тут, на гэтых старонках, шмат гадоў назад вы ўпершыню прачыталі пра гэты дуд прыроды.

Перачытайце Маўра сёння, перачытайце не толькі для дзяцей сваіх, але і для сябе. Бо ён з тых, хто, як казаў Бялінскі, прымушае дарослага чытача перанесціся «лёгкай мараю ў светлыя гады свайго маленства». І таму ён застаецца вашым сябрам на ўсё жыццё.

Кожны з нас, хто нарадзіўся і вырас у Беларусі (а мо і не толькі ў Беларусі), пэўна памятае, калі ўпершыню сустрэўся ён з Янкам Маўрам. Для мяне ён у дзяцінстве быў адным з многіх любімых пісьменнікаў, але зусім не падобным на іншых. У дзяцінстве амаль кожны дзень прыносіць новых уладароў дум, новы свет кніжных прыгод і жаданне прыняць у іх удзел. І вось раптам побач з прыгодамі Рабінзона Крузо і капітана Гатэраса ўзнікаюць незвычайныя прыгоды двух хлапчукоў, амаль тваіх равеснікаў. І прыгоды, якіх так прагне дзяцінства, становяцца амаль даступнымі — усё гэта адбываецца тут, паблізу, у тваёй Беларусі. І цяжка было адагнаць неўгамонныя мары і стрымаць радаснае чаканне: паеду летам у вёску да бабулі, а там да прыгод — рукой падаць.

Вось так для мяне першай кнігай Янкі Маўра былі «Палескія рабінзоны». А пасля — дзіцячы гнеў і смутак над «Слёзамі Тубі», нязвычнасць, нечаканасць ідэі ў «ТВТ». Тады гэта ўспрымалася па-дзіцячы непасрэдна і, калі можна так сказаць, па-спажывецку: цікава, хвалюе, захапляе. Значна пазней, паставіўшы творы Янкі Маўра ў агульны рад кніг савецкай дзіцячай літаратуры, кожны з нас убачыў іх сапраўднае значэнне і па-новаму ацаніў іх высокае майстэрства. Аповесць «ТВТ» апярэдзіла ідэю і тэму гайдараўскага «Цімура». А «Слёзы Тубі»... Колькі б ні было напісана твораў аб бесчалавечнасці каланіялізму, аб горкай долі дзяцей у краінах капіталу, гэта апавяданне застанецца жамчужынай нашай дзіцячай літаратуры.

Хто такі Янка Маўр? Спытайце настаўнікаў, бібліятэкараў, важатых, яны вам раскажуць, як часта спрачаюцца аб гэтым юныя чытачы. Надзвычай сур'ёзна, з пераканаўчай аргументацыяй даводзяць хлапчукі, што ён, безумоўна, марак, а, можа нават, кітабой, ці капітан далёкага плавання. Іншыя, робячы папраўку на сённяшні дзень, бачаць у ім геолага і вучонага і гэтым тлумачаць яго веданне зямлі, прыроды, гісторыі.

Дзеці спрачаюцца, хто ж ён, іх любімы пісьменнік. А ён — настаўнік. Зрэшты, любы дзіцячы пісьменнік — настаўнік. А Янка Маўр — настаўнік і па прафесіі, па адукацыі. І таму шмат гадоў назад ён паставіў сабе мэтаю дапамагчы тым, хто ў юныя гады возьме ў рукі яго кнігі, расці смелымі, разумнымі, высакароднымі. І вось ужо больш за сорак гадоў (першая кніга Янкі Маўра «Чалавек ідзе» выйшла ў 1924 годзе) радуе ён усіх нас сваімі творамі.

«Галоўная рэч, як мага менш сентэнцый, павучанняў і рэзанёрства. Іх не любяць і дарослыя, а дзеці проста ненавідзяць», — пісаў Бялінскі. Менавіта так умее гаварыць з дзецьмі Янка Маўр. Рамантыка і педагогіка так выдатна сплаўлены ў яго кнігах, што ўсё, чаму хоча навучыць пісьменнік сваіх юных чытачоў — мужнасць, таварыскасць, шчырасць, сумленнасць, — уваходзіць у іхнія душы непрыкметна, разам з займальным сюжэтам, з цікавымі прыгодамі.

Шмат гадоў жывуць цудоўныя кнігі Янкі Маўра побач з намі. І цяпер можна сказаць, што ніхто не зрабіў для беларускай дзіцячай літаратуры столькі, колькі ён. І не толькі таму, што цяпер кожны, хто бярэцца пісаць прыгодніцкую аповесць, мае перад сабою цудоўныя ўзоры. Не толькі таму, што ён актыўна, нястомна і дзейсна працягвае выхоўваць у юным чытачу пачуццё дружбы да другіх народаў, сапраўдны інтэрнацыяналізм і прымушае любавацца непаўторнай прыгажосцю роднага краю. Але яшчэ і таму, што ён палічыў неадменным законам для дзіцячай літаратуры спалучаць дзве якасці: вучыць і захапляць. І не здрадзіў гэтаму закону ні разу.

Я ўспамінала сваё першае знаёмства з пісьменнікам, першую яго кнігу, прачытаную мною. А вось апошняе ўражанне: зусім нядаўна, чытаючы свежы нумар «Вясёлкі», я сустрэлася на яго старонках з даўнім знаёмым — чароўным эцюдам Янкі Маўра «Шчасце». Эцюд гэты паявіўся дваццаць гадоў назад, а зараз, да юбілею пісьменніка, часопіс зноў змясціў яго. І зноў — уласцівасць сапраўднага твора — апавяданне ўсхвалявала, замілавала па-новаму. Як і раней, з удзячнасцю падумала: колькі ў ім дабраты, усмешкі, мудрасці, якое разуменне дзіцячай псіхалогіі! І па-новаму прачыталіся апошнія радкі апавядання: «І мы абодва, зноў шчаслівыя, разышліся кожны сваёй дарогай». **Зноў** шчаслівыя. Я пачула напамін пісьменніка: будзьце ўважлівыя, чулыя. Памятайце, часам ад вашай чуласці залежыць шчасце іншых людзей.

Дзякуй яму за такія напаміны!

**Р. ПІЯТУХОЎСКАЯ.**

---

Янка МАЎР

# АД ДВУХ ДА ПЯЦІ

*У СКАРБОНКУ КАРНЕЯ ІВАНАВІЧА ЧУКОЎСКАГА*

### ПЕРШАЕ ВЫПРАБАВАННЕ

Мой унучак, Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч, за сваю першую пяцігодку прайшоў вялікі жыццёвы шлях: быў міліцыянерам, лётчыкам, пажарнікам, не мінулі яго і прафесіі шафёра, паштальёна, музыканта і г. д. Можна смела сказаць, што колькасць пасад, якія ён займаў, значна перавышала колькасць гадоў, якія ён пражыў, нават уключаючы сасунковы перыяд.

І за ўвесь гэты час ён ні разу не пакрывіў душой, ніколі нікога не ашукаў, ні разу не схлусіў, быў самым прынцыповым членам грамадства. Але нарэшце надышоў дзень, калі і да яго прыйшла гадзіна выпрабавання, першага выпрабавання.

У адзін святочны дзень маці захацела весці яго ў цырк, пад вечар. Хоць праграма цырка наогул была дзіцячая, але такіх малышоў, як Косцік, не пускалі. Тады мама пачала «падрыхтоўваць» яго:

— Косця, хочаш у цырк?

— Хачу.

— Колькі табе гадоў?

— Праз два месяцы будзе пяць, — упэўнена адказаў ён.

— Дык вось, калі мы прыйдзем у цырк, цёця спытае: колькі табе гадкоў, скажы, што пяць і яшчэ месяцы два.

У Косціка аж вочы на лоб палезлі.

— А... а... навошта хлусіць?

— У цырк сёння не пускаюць дзяцей да пяці гадоў, вось ты і скажы, што табе больш.

— А хіба можна казаць няпраўду?

Цяпер ужо ў мамы вочы на лоб палезлі.

— Бачыш, — замармытала яна, — хлусіць, вядома, нядобра, але тут нікому ніякай шкоды не будзе...

Маці і так і гэтак выкручвалася, пакуль не супакоіла яго ваганні сваім аўтарытэтам. Але ў цырк хлопчык уваходзіў вельмі напружаны, са страхам пазіраючы то на маму, то на «цёцю». Нарэшце ён не вытрымаў і спытаўся ў мамы:

— А пасля мне можна будзе казаць праўду?

— Можна, можна! — падхапіла маці. — А цяпер ты можаш проста сказаць — не ведаю.

— Гэта таксама няпраўда, — нахмурана бухнуў хлопчык.

На гэты раз выпрабаванне скончылася «шчасліва»: цёця спыталася не ў Косціка, а ў мамы, якая і вымушана была схлусіць сама.

Доўга яшчэ ў гэты вечар мама і тата абмяркоўвалі сённяшняе здарэнне. І чым больш яны разважалі, тым велізарней рабілася гэтае пытанне...

А тым часам нашаму Кастусю прысніўся дзед Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч, які сказаў, як той Тарас Бульба:

— Добра, унучак! Трымай так і далей!

### ГЭТА БЫЛО ДА ТАШКЕНТА

Таня і Оля — блізняты. Хоць характары іх розныя, яны добра ведаюць сваю блізкасць. Калі ўбачылі на вуліцы два аднолькавыя аўтобусы, то зараз жа спыталіся ў мамы:

— А гэтыя аўтобусы таксама блізняты?

Наогул можна сказаць, што яны любілі адна адну і жылі мірна. Але адно памылковае мерапрыемства мамы парушыла мірнае жыццё. Кожную раніцу яна была вельмі занятая, і ёй хацелася, каб дзяўчаткі хутчэй навучыліся адзявацца самастойна. І яна ўрачыста абвясціла конкурс: хто першы адзенецца, той атрымае прэмію.

А на другі дзень яна ўжо шкадавала аб сваім «мерапрыемстве»: у кухню са спальні даляцелі крыкі, шум, плач.

Прыбегла маці і ўбачыла, што тут ідзе вайна за першае месца:

— Не хачу, каб яна была першая!

— А я не хачу, каб ты была першая!

— Яна вельмі хутка схапіла сваю сукенку, а я не паспела!

— А чаму ж ты не паспела?..

Пачала мама іх уціхамірваць, сароміць, выказала шмат павучальных слоў і прымусіла даць абяцанне больш не сварыцца.

Аднак на другі дзень зноў пачуліся спрэчкі і шум, але прыглушаныя. А праз некалькі хвілін усё сціхла.

Маці пацікавілася і асцярожна ўвайшла ў спальню.

Глядзіць — сядзяць ціхенька, нешта балбочуць, адна павольна адзяецца, другая трымае сваё плацейка ў руках і нібы чагосьці чакае.

— А ты чаму не адзяешся? — спытала маці.

— А сёння яе чарга быць першай, — спакойна адказала Таня.

— Як добра вы зрабілі, дзеткі мае! — усклікнула мама, пацалавала дзяўчынак і пабегла да бацькі.

— Чуеш, што яны прыдумалі?

Бацька, ваенны, выслухаў яе і сказаў:

— Эх, каб заакіянскія дзядзі дараслі да маральнага ўзроўню гэтых дзяўчынак і таксама маглі вырашаць канфлікты мірнымі перагаворамі! Якое было б шчасце для ўсёй зямлі!

...Праз чатыры месяцы адбылася вядомыя ўсяму свету перагаворы ў Ташкенце. Але якую ролю адыграў тут прэцэдэнт Тані і Олі, — мы яшчэ не ведаем.

---

## Выйшлі з друку

**ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»**

**Алесь Асіпенка.** Жыта. Аповесць. Мастак А. Дэмарын. 1968 г. Тыраж 12000 экз. 288 стар. Цана 48 кап.

**Альбом «Мінск».** На беларускай, рускай, англійскай, нямецкай і французкай мовах. Фотаздымкі Зянона Пазняка. Тэкст на шмуцтытулах Тараса Хадкевіча. У подпісах пад фотаздымкамі выкарыстаны радкі з вершаў беларускіх паэтаў. 1968 г. Тыраж 20000 экз. Цана 1 руб. 73 кап.

**Алесь Бажко.** Татры. Карвіга пакідае хутар. Паэмы. Мастакі У. і М. Басалыгі. 1968 г. Тыраж 8000 экз. 148 стар. Цана 71 кап.

**Эдуард Валасевіч.** Казёл адпушчэння. Выбраныя байкі. Мастак В. Ціхановіч. 1968 г. Тыраж 8 000 экз. 128 стар. Цана 39 кап.

**Віктар Карамазаў.** Падранак. Апавяданні. Мастак Г. Скрыпнічэнка. 1968 г. Тыраж 9 000 экз. 168 стар. Цана 22 кап.

**Уладзімір Корбан.** Свінні ў рэпе. Байкі. Мастак А. Чуркін. 1968 г. Тыраж 8 000 экз. 120 стар. Цана 37 кап.

Тамара МЕЛЬЯНЕЦ. «ВЯСНА». (Лінагравюра).

---

ПІШУ НАД РАКОЮ, на ўжо адрослай пракошы (хай мой блакнот прапахне травяною свежасцю!..), у лагодным і час ад часу прыглушаным хмаркай сонцы позняга адвячорка.

Само неяк леглася на траву. Нібы ва мне сабралася нямала прагі да спакою, да адпачынку, да цішыні — так неабходнай для нашай працы.

Сюды ішоў летнім лесам, па сцежцы ў гушчары, добра знаёмай, а цяпер зарослай, заваленай голлем і цэлымі дрэвамі, што пападалі наўпоперак і ляжаць, нібы наўмысныя завалы.

Ідучы, слухаў вурчанне туркачоў, — то як мурлыканне ката, то як журботнае кумканне жабаў, то нават часамі як хорканне нездаволеных парасятак.

Цяпер, над Свіслаччу, пачуў жабіна кумканне з ціхіх завоін і падумаўся, што ў іх гэта — не проста нейкая там фізіялагічная неабходнасць, а ціхая музыка, вельмі ж паэтычна сумная. Сваёй таямнічасцю ды незвычайнасцю гэтая музыка непакоіла мяне і ў маленстве, калі я менш за ўсё думаў пра асэнсаванне прыгажосці, а проста браў яе — заслуханы, загледжаны, зачараваны...

Ці не адтуль, ад той зачараванасці, узнікла цяпер жаданне легчы на траву, заціхнуць?..

Пакуль пісаў гэта, зашчабяталі за кустамі ластаўкі. Густа, дружна і міла. Таксама спадарожніцы майго далёкага пачатку.

■

У былым княжацкім парку, на вялікай паляне — шырокая паласа цямнейшай травы.

Як гэта проста і як гэта страшна — чаму яна цямнейшая!.. Тут у сорак другім годзе гітлераўцы закапалі паўтары тысячы нашых людзей.

Днямі я быў падумаў, нават нібыта жыва ўявіў, што вось яны ўсталі, жывуць... Ідуць па парку. Усе — са сваімі старэчымі, маладымі, дзіцячымі асаблівасцямі жывых...

Аднак, запісаць тады — не запісаў, бо не ўявіў, як здалося, на ўсю глыбіню.

А хіба ж цяпер уяўляю?..

■

Цудоўная музыка — «Танец маленькіх лебедзяў»!.. Асабліва тады, калі прамінула вялікая небяспека, бяда, калі хочацца ціха заплакаць ад шчасця.

Відаць, таму ў мяне такое адчуванне, што я яе, здаецца, упершыню ў жыцці пачуў і назаўсёды палюбіў улетку сорак пятага года, на праглядзе мастацкай самадзейнасці беларускіх дзіцячых дамоў.

Танцавалі маленькія дзяўчаткі-сіраты, дужай народнай рукой уратаваныя ад фашысцкага знішчэння.

■

Убачыў у беластоцкай «Ніве» партрэт маладзенькага хлопца, «энтузіяста роднай справы», і цёпла, ледзь не расчулена падумаў пра яго — збоку, з дыстанцыі ўзросту, успомніўшы, што я быў амаль такі самы — **калісьці.**

Раней так думалася пра маленства. Цяпер я ўжо думаю так і пра маладосць.

І гэта не сумна, што ўжо і яна — таксама **калісьці.** Не вельмі сумна, калі з любоўю думаеш вось пра такіх, як гэты — юнак з харошай, чыстай усмешкай.

■

Прага шчасця настолькі вялікая ў нас, што нават самыя шчаслівыя моманты, дні, тыдні, гады часцей за ўсё здаюцца... уступам да шчасця.

■

Ты пачынаешся тады, калі ты застаешся, адзін, калі ніхто і нішто не памагае табе быць добрым ці дрэнным, калі ты робіш выбар сам.

■

Яму нямілы сёння ўвесь свет, бо ён агідны сам сабе, і ўсё, што напісаў, здаецца такім безнадзейна бяздарным...

Ідзе — абы ісці. Зайшоў у магазін мастацкіх вырабаў. Пажылая прадаўшчыца, жанчына ажно саладжавая ад службовай стараннасці, прапануе яму, незнаёмаму, сумнаму інтэлігенту, вельмі цікавую навінку. Гэта — разны пісьмовы прыбор... з люстэркам. Пішы ды пазірай, любуйся сам сабою...

І ён павесялеў. Нават зарагатаў. Жанчыне здалося — дзіўна і дзікавата.

■

Даволі часта чалавечы дур праяўляе ўласцівасць захоўвацца ў свежым выглядзе да самага паважанага ўзросту.

■

Цётка ўсё наракала, войкала: «Ой, гора, гора!..» І пачалі яе зваць Горай. Ну, а мужа — адпаведна — Горам.

Пайшоў аднойчы дзядзька Гор у заработкі з касой, на князева ўрочышча Пісараўшчыну. Махаў, пацеў цэлы дзень, а ідучы дахаты (і сапраўды — «ой, гора, гора!..») згубіў зароблену саракоўку.

З таго часу і ходзіць па нашай вёсцы свая, мясцовая прыказка, гадоў каля сотні:

«Зарабіў, як Гор на Пісараўшчыне».

Толькі ўсё менш ды менш людзей памятае, адкуль яна з'явілася.

І яшчэ адна:

«Спазніўся, як кожаўскі святы».

У недалёкай вёсцы Кожава завялася была калісьці нейкая секта. Дайшлі да таго, што іхні «старэйшы брат», прапаведнік, павёў тых дзядзькоў ды цётак з сем'ямі ў белы свет, — па-святому пісанню: «Идите и проповедуйте евангелие всей твари». Выйшлі за вёску, і тут адзін дзядзька спыніўся ды кажа:

— Брацця і сёстры, забыўся я свіней з хлява выпусціць. Зашто будзе скацінка божая пакутаваць?.. Пайду я выпушчу яе і даганю вас.

Пабег і... не вярнуўся «кожаўскі святы». Так і спазніўся ў царствія нябеснае.

■

— Якога ты хочаш ладу ў нашым праўленні? Воз са Львова, пан з Кракова, коні са Смаргоні, а фурман з Ашмян... Збор дружыны. Ды кожны глядзіць у свой бок.

■

Паўгадзіны ў мокрым ліпеньскім лесе.

Дождж разбудзіў мяне шумам за вокнамі. А можа гэта я сам прачнуўся — насустрач ягонаму шуму?.. Падумалася, гледзячы на зялёную лісцяную сцяну: шум дажджу ўзмацняецца ад таго, што сеецца ён на процьму лістоты і гліцы. Падумаеш — адкрыццё! А вось жа прыемна было, нібыта ўпершыню такое ўсвядомілі.

У гушчары, калі я пайшоў туды, спачатку па асфальтавай дарожцы, над якой ледзь прыкметна ўздымалася пара, а потым па роснай сцяжыне, прыемна было глядзець на мокрае, крамінае дубовае лісцё, успамінаючы таксама моцны і сыты капусны ліст. Сонца спачатку было за павалокай, і не спяшалася выходзіць з-за яе. Аднастайна, распешчана, прасіў ліць юрок. Амаль незаўважны ветрык паварушваў сям-там лістоту, раз-поразу ціхенька пашумвалі, ападалі долу маленькія мясцовыя дожджыкі. Абапал сцежкі — бурачкова-рудовыя кветкі канюшыны. Сімвал пакойнага, лагоднага, няпрагнага дастатку, — калі ўспомніш гэтыя кветкі ў вялікай масе, густую, рудовую канюшынную кашу. У канюшыне абапал сцежкі зрэдку стаяла сціплая белая кашка. У мокрым гушчары сыта мурлыкаў туркач. Дзіўна паводзіў сябе дождж, — памаўчыць, памаўчыць і зноў шуміць па лістоце, ідзе. Нібыта чалавек, што думае, а потым плача зноў...

Сонца ўзяло сваё. Калі я з мокрых сцяжын выйшаў зноў на асфальт, лісцё з паўднёва-ўсходняга боку было ўжо амаль сухое.

Зноў успомніў тое, што думалася днямі пра апісанні прыроды. Нешта не вельмі выразнае, але прыемнае, светлае. Нібыта ў Канапніцкай ці ў іншай з польскіх жанчын чытаў пра гэта. Адчуванне красы, удзячнасць за радасць гэтага адчування, думка пра векавую тугу чалавецтва — ах, як бы нам пачаць нарэшце жыць разумна, згодна, шчасліва!.. Падумалася цяпер, што толькі ў гэтым, у такім адчуванні красы прыроды, і ёсць адзіны сэнс яе апісвання.

■

Позняя восень. Цёмная ноч. І не спіцца.

Уяўленне настойліва малюе мне, падсоўвае, мяняе краявіды — ва ўсёй шматколернай красе. Я не ўспамінаю іх, убачаныя калісьці, — яны з'яўляюцца па загаду, па жаданню майму — новыя, цудоўныя, жывыя. Магчыма, яны манцыруюцца падсвядома з успамінаў, з розных кавалкаў у адно?.. Не ведаю. Яны іграюць усімі барвамі жыцця, яны хвалююць, і мне... так прыемна ад гэтай бяссонніцы.

■

Вось праблема — ведаць, што ты жывеш толькі сёння, што няма чаго адкладваць многае на заўтра, няма чаго кудысьці ўсё спяшацца... А чаго? Каб потым азірнуцца і заплакаць? Што бег ды не дабег, а многае мінуў?..

■

Дарога каля зялёнай сцяны пераважна сасновага лесу. Ціхага, мокрага. Узбоч дарогі — многа камення, што, як лішняе, выкачана сюды за шмат гадоў арацьбы. Жыта — радаснае мноства хлеба, узнятае над зямлёй у недаспелых яшчэ каласах. Мокры рамонак, хоць дажджу ўжо даўнавата няма, паапускаў пялёсткі абапал жоўтых лысін. Многа яго — і на ўзмежку, і ў жыце, радчэйшым каля дарогі.

У такой адзіноце, такой цішыні — проста малітвенны настрой душы. Жыццё бачыцца нібы наскрозь, ад пачатку і наперад, што было і што трэба яшчэ паспець завяршыць.

---

### ЧЫТАЧЫ ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ

△ У госці да барысаўчан прыехаў брат народнага песняра Якуба Коласа — дзядзька Юзік. Іосіф Міхайлавіч Міцкевіч выступіў перад рабочымі і служачымі фабрыкі «Прафінтэрн», завода гідраапаратуры, вучнямі школ горада. Ён падзяліўся ўспамінамі пра паэта, прачытаў урыўкі з паэмы «Новая зямля».

**А. БЕНЯНСОН.**

△ У Гомельскім кніжным магазіне «Светач» адбыўся літаратурны вечар пачынаючых аўтараў — студэнтаў педінстытута і артыстаў самадзейнага ансамбля «Васілёк» Светлагорскага Дома культуры энергетыкаў. Маладыя паэты прачыталі свае вершы, самадзейныя артысты выканалі песні. Выкладчык педінстытута М. Янкоўскі расказаў пра навіны беларускай паэзіі.

**Р. АНДРЫЯВЕЦ.**

△ Вялікай павагай у жыхароў вёсак Заброддзе, Хісцецкі Бор, Відошчын і Сяменга Жыткавіцкага раёна карыстаецца камуніст-кінамеханік Рыгор Балдзенка. Ён старанна рыхтуе кожны сеанс, шмат увагі аддае рэкламе фільмаў, заўсёды імкнецца выконваць заяўкі гледачоў. За добрасумленную работу Р. Балдзенка ўзнагароджаны значкам «Выдатнік кінематаграфіі СССР».

**М. ЖЫГОЦКІ.**

## па выставачных залах

# РАЗНАСТАЙНАСЦЬ? НЕ, СТРАКАТАСЦЬ...

Перад тым, як паглядзець выстаўку твораў маладых мастакоў у мінскім мастацкім салон-магазіне, я прагарнуў кнігу водгукаў. Зрабіў гэта, каб адчуць уздзеянне работ маладых мастакоў на гледачоў. Скажу шчыра: кніга водгукаў дапамагла мне знайсці пункт погляду, неабходны, каб ацаніць гэтае вельмі разнастайнае і ў нечым супярэчлівае відовішча.

Запісы ў кнізе водгукаў пакінулі ў асноўным студэнты. Калі меркаваць па безапеляцыйнасці ацэнак, па дынаміцы стылю гэтых запісаў,— творчая моладзь «дзяліла лаўры»... Пры гэтым, звярніце ўвагу, не вызначаны які-небудзь адзін «прэм'ер», якому дастаўся б увесь вянок. Не!.. Кожнаму ўдзельніку выстаўкі дасталося па лісціку «высакароднага лаўра».

І сапраўды, выстаўка роўная, без вострых вуглоў і без правалаў. Удзельнічалі ў ёй толькі мастакі, якім неўзабаве ўступаць у творчы саюз. (Дарэчы, звычайна такія выстаўкі шырокаму гледачу чамусьці не паказваюць. Ды і гэтую адкрылі на вельмі кароткі тэрмін). Работы зроблены пісьменна, адчуваецца нядрэнная «школа»... Можна сказаць нямала добрых слоў пра гэтыя работы. Але мяркую, што куды карысней паспрачацца з іх аўтарамі, закрануць набалелыя пытанні творчасці нашай моладзі.

Перш за ўсё — аб падыходзе да жыцця. Я не хачу сказаць, што ў маладых мастакоў — толькі добрая тэхніка і больш нічога за душой няма. Гэта не так! Яны спрабуюць знайсці свае тэмы, свае праблемы. І вырашаць іх імкнуцца пасвойму. Але... Пра спевака часам кажуць, што яму нестае голасу. Напэўна, тое ж атрымліваецца і з маладымі мастакамі: сказаць ім хочацца шмат, але замінае нейкая грамадзянская коснаязыкасць, вузкасць мыслення. Гэта асабліва адчуваеш, калі ахопіш позіркам усю выстаўку: на ўсім адбітак фрагментарнасці, быццам мастакі глядзяць на жыццё праз нейкую вузкую шчыліну і не гавораць на поўны голас.

Вось асабліва яркі прыклад: карціны мастака П. Свентахоўскага. Тут добрае каларыстычнае вырашэнне. Добра перададзены настрой. Але творы не вырастаюць да ўзроўню сапраўднага жывапісу.

Мастаку, як вядома, мала дакладна адлюстраваць тое, што бачыш,— трэба яшчэ і абагуліць убачанае, пэўным чынам асэнсаваць яго. А гэта ў дадзеным выпадку не атрымоўваецца. Здаецца, што аўтар спачатку зрабіў эцюды, а потым механічна павялічыў іх да памераў карцін. Эцюд жа, як яго ні павялічвай, застаецца эцюдам. У яго—свае законы кампазіцыйнага рашэння, свае спосабы выканання. Часцей за ўсё гэта імгненнае ўражанне, дынамічныя намёткі будучай кампазіцыі. І калі эцюд павялічваюць да памераў карціны, удакладняюць яго дэталямі, «наводзяць бляск»,—ён перастае ўжо быць эцюдам, але... і карцінай не становіцца...

Амаль усе жывапісныя работы, прадстаўленыя на выстаўцы, маюць характар павялічаных эцюдаў. І гэта не ад нястачы прафесійнага ўмельства, а ад таго, што многія мастакі, навучыўшыся добра маляваць, не зусім усведамляюць, навошта ім гэтая навука. Адсюль выцякае і іншае: калі малады мастак бярэцца за вялікую агульначалавечую тэму і спрабуе вырашыць яе мовай фарбаў — не заўсёды яму стае філасофскай глыбіні. Гэтак атрымалася з работай мастака І. Капляна «Сумленне». Перш-наперш паўстае пытанне: чаму менавіта «Сумленне»?.. На пярэднім плане гэтай работы — засмучаная дзяўчына, на другім — старажытны воін у даспехах, а па кутах — дамы, якія падаюць, распяты Хрыстос. Калі нават спрабуеш адкінуць убок усе прасталінейныя асацыяцыі, калі спрабуеш абстрагавацца ад усялякіх думак, што ляжаць на паверхні,—усё роўна губляешся. Чаму? Нозразумела! Аўтар хацеў сказаць многа, увёў у карціну шмат атрыбутаў-сімвалаў, але да сапраўднай сімволікі засталася вялікая дыстанцыя... І кампазіцыйна карціна, перагружаная сімваламі, распадаецца на кавалкі, не звязаныя нечым агульным...

Трэба сказаць, што калі той жа І. Капялян падыходзіць да тэмы, якая ў яго сапраўды набалела, калі не мудрагельствуе, а кажа пра тое, што сапраўды яго хвалюе, ён падымаецца да пэўных вяршынь, як пра гэта сведчаць яго графічныя лісты «Мужнасць» і «Цішыня» з серыі «Вайна і дзеці».

Графіка на выстаўцы твораў маладых мастакоў увогуле значна цікавейшая за жывапіс. «Мова» маладых графікаў лапідарная, яны засвоілі, што на агульных месцах не выедзеш — патрэбна думка, аўтарскае стаўленне да рэчаіснасці. Маладыя графікі даказваюць, што мысліць яны могуць. Гэта бачна ў работах П. Драчова, В. Шматава, у эскізах дэкарацый Б. Казакова і асабліва ў ксілаграфіях А. Зайцава, вельмі цэльных як па выкананню, так і па падыходу да тэмы.

Не магу тут не сказаць аб стаўленні маладых да нацыянальнай мастацкай спадчыны, паколькі аўтары запісаў у кнізе водгукаў—тыя, што «дзялілі лаўры», — быццам дамовіліся правесці «конкурс» на самага «шчырага» беларускага мастака. Пры гэтым кожны прысуджаў «пальму першынства» нейкаму «свайму» мастаку, начыста адмаўляючы астатнім у нацыянальных рысах іх творчасці. Чытаеш гэтыя водгукі і бачыш: і ў маладых мастакоў, і ў іх «рэцэнзентаў» вельмі аднаснае ўяўленне аб тым, што гэта такое — нацыянальная форма. Ці ж можна сцвярджаць пра пэўны твор, што вось у ім— наша роднае беларускае, паколькі там намаляваны сяляне ў лапцях і даматканых кашулях? Нацыянальная прыналежнасць твора залежыць не толькі ад атрыбутаў старадаўняга побыту. Карэнні нацыянальнага — глыбей. Мала намаляваць жанчын, якія адбельваюць ільняныя палотны, каб можна было гаварыць аб тым, што мастак творыць у рэчышчы нацыянальных традыцый. Якія б ні прыцягваліся атрыбуты нацыянальнай сімволікі, звычаяў, абрадаў і г. д., паўнацэннага выяўлення нацыянальнага не можа быць без глыбокага пранікнення ў духоўны свет народа, без адзінства тэмы, думкі, пластычнага рашэння твора. (Тым больш, што сфера нацыянальнага далёка не абмяжоўваецца спадчынай: нацыянальнае жыве і плённа развіваецца і сёння). А вось менавіта адзінства тэмы, думкі, сродкаў выяўлення амаль няма ў творах маладых мастакоў. Ды і чаму тут дзівіцца. Мы шмат разважаем пра мастацкую спадчыну. Але дзе можна ўбачыць тыя ўзоры народнага мастацтва, без дасканалага вывучэння якіх размовы аб развіцці традыцый нічога не дадуць? Выстаўка, пра якую ідзе гаворка, пераканаўча сведчыць, наколькі патрэбны спецыяльныя экспазіцыі ў музеях твораў нацыянальнага мастацтва, у тым ліку народнага — сучаснага і мінулых стагоддзяў...

Кажуць, што лыжкай дзёгцю можна сапсаваць бочку мёду. Я не спрабаваў мяшаць першае з другім, не спрабаваў і падзяліць мёд і дзёгаць між рознымі ўдзельнікамі выстаўкі. Хацелася акрэсліць найбольш істотныя пытанні, вырашаць якія адчуває патрэбу кожны ўдзельнік выстаўкі, бо сама выстаўка— дэманстрацыя пошуку сваёй тэмы, свайго пункту гледжання на рэчы, свайго героя.

А. БЕЛАВУСАЎ.

# ПАЛЫМНЕЮЦЬ ЛЯ ПОМНІКАЎ КВЕТКІ

**6-га МАЯ — ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА НАРОДНАЕ ШЧАСЦЕ Ў МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ**



Схілены галовы зембінцаў. Хвілінай маўчання ўшаноўваюць яны памяць сваіх аднавяскоўцаў.

...Ля помніка ўсё падобна на сплаў мармуру і цішыні... Людзі, вянкі і шмат кветак... І вось урачыста, усхвалявана гучыць голас вядучага — дырэктара школы Канстанціна Уладзіміравіча Геца:

— Яны былі нашымі бацькамі, братамі, сынамі, сёстрамі, маці. Яны былі нашымі таварышамі, аднапалчанамі, суседзямі.... Успомнім сёння пра іх. Успомнім усіх, хто змагаўся за шчасце народнае. Успомнім герояў паіменна.

Нізка схіляюць галовы калгаснікі сельгасарцелі «Зара камунізма» Барысаўскага раёна. Схіляюць, каб ушанаваць памяць землякоў, якія вечна ў сэрцах.

— Ішчанка Ілья Цімафеевіч...

Так, людзі помняць яго — удзельніка рэвалюцыі 1905 і 1917 гадоў, актыўнага змагара за Савецкую ўладу ў Зембіне. Загінуў на грамадзянскай...

— Партызан Урбановіч Дамінік Фролавіч... Загінуў пры ўзрыве мста на рацэ Гайне.

— Артылерыст Апанас Васільевіч Амосаў... Загінуў пад Берлінам...

118 чалавек не вярнулася з франтоў Айчыннай у калгас... Бацькі, сыны, браты.

Тыя, што сабраліся ля помніка, абавязаны загінуўшым мірам, сваімі радасцямі, сваім плугам у полі, кнігамі, домам. І яны прыйшлі, каб яшчэ раз сказаць героям дзякуй, каб пакланіцца сваёй Радзіме, якая шмат разоў сустракалася з горам, вынесла і перамагла.

...Сонца сваёй пяшчотнай рукой гладзіць вянкі і букеты свежых кветак, якія зараз укрываюць мемарыяльныя дошкі на плошчы Мінскага паравознага дэпо. Там занесены імёны тых, каго не зламала ні гестапа, ні лагеры смерці ў гады вайны. У гэты дзень былі названы імёны падпольшчыкаў бацькі і сына Маркевічаў—Міхаіла Еўстаф'евіча і Міхаіла Міхайлавіча, якіх забілі ў канцэнтрацыйным лагеры «Трасцянец», кіраўніка дыверсійнай групы Хацько Вікенція Данілавіча, закатаванага гестапа, машыніста Яцкевіча Уладзіміра Аляксандравіча, які трагічна загінуў летась пры выкананні свайго абавязку, і другіх, што аддалі жыццё дзеля людскога шчасця.

...Больш дзесяці тысяч букетаў кветак, сабраных на палях баравых полянках і лугах, прынеслі калгаснікі, будаўнікі, шахцёры Салігоршчыны ў мястэчка Пагост да помніка — танка і магілы экіпажа Героя Савецкага Саюза Зіноўева Мікалая Анісімавіча. Тут і былі названы дарагія імёны загінуўшых.

У ганаровай варце памяці герояў стаяла маці героя-танкіста Зіноўева Ксенія Апанасаўна, яго брат, сёстры, якія прыехалі з далёкай Пензы.

Так было 6-га мая ў многіх вёсках і гарадах Міншчыны.

Героі бясконца дарагія ўсім жывым. Яны заўсёды з намі, у нашых сэрцах. І працоўныя Міншчыны ў гэты дзень у час урачыстых мітынгаў, народных шэсцяў, вечароў успамінаў пакляліся пранесці праз жыццё светлую, чыстую памяць аб тых, хто абараніў нашу свабоду.

З гэтага года 6 мая будзе на Міншчыне традыцыйным Днём памяці барацьбітоў за народнае шчасце.

Р. КАДЗЕТ.

# ПАМЯЦІ А. В. ФЛАРОЎСКАГА

У Празе на 84-м годзе жыцця памёр адзін з буйнейшых вучоных славянскага свету, нястомны даследчык міжславянскіх сувязей, вядомы скарынаназнаўца прафесар Антоній Васільевіч Флароўскі.

Навукова-літаратурная дзейнасць А. В. Флароўскага пачалася ў 1910 годзе, калі была выдадзена яго першая кніга па гісторыі сацыяльных адносін і сацыяльнай палітыкі ў Расіі пры Екацерыне II. Да рэвалюцыі А. В. Флароўскі апублікаваў рад артыкулаў і даследаванняў па гісторыі старажытнай Русі ў XVIII—XIX ст.ст. Пасля пераезду ў Чэхаславакію вучоны заняўся новай для яго праблематыкай — чэшска-рускімі адносінамі ў X—XVIII ст.ст. Многія старонкі даследаванняў А. В. Флароўскага прысвечаны непасрэдна Беларусі, яе гісторыі і культуры.

Да беларускіх тэм А. В. Флароўскі звяртаўся і раней, пры чытанні курса гісторыі старажытнай Русі ў Наварасійскім універсітэце, а ў 1917—1918 гг. у Адэсе ён прачытаў некалькі спецыяльных лекцый па гісторыі Беларусі для групы беларусаў, якія жылі тады ў Адэсе.

Да канца свайго жыцця А. В. Флароўскі захаваў цёплыя ўспаміны пра нашых землякоў, з якімі тады сустракаўся. З павагай прыгадваў ён свае размовы з маладым тады беларускім паэтам Міхайлам Грамыкам.

У двухтомніку А. В. Флароўскага «Чэхі і ўсходнія славяне» непасрэдна Беларусі прысвечаны тыя раздзелы, дзе разглядаюцца культурныя і асабліва літаратурныя сувязі Чэхіі з усходнімі славянамі ў XV і наступных стагоддзях, а таксама сувязі гандлёвыя паміж Чэхіяй, Маравіяй і Беларуссю. Апошняя тэма значна глыбей была распрацавана ў кнізе «Чэшска-рускія гандлёвыя адносіны ў мінулым» (Прага, 1954).

Даследуючы культурныя сувязі паміж Чэхіяй і ўсходняй Еўропай, А. В. Флароўскі падрабязна разгледзеў праблему чэшскага ўплыву на ўсходнееўрапейскую культуру і пісьменнасць і асаблівую ўвагу прысвяціў жыццю і дзейнасці Францішка Скарыны. Флароўскі змог выявіць новыя факты і абставіны, якія характарызавалі сувязь беларускага першадрукара з Чэхіяй. Вынік шматгадовых даследаванняў скарынінскай спадчыны падведзены ў кнізе Флароўскага «Чэшская Біблія ў гісторыі рускай культуры і пісьменнасці» (Прага, 1947).

Багатыя звесткі па гісторыі чэшска-беларускіх культурных адносін можна знайсці і ў кнізе «Чэшскія езуіты на Русі» (Прага, 1941), дзе аўтар давёў, што вялікая частка ўсходнеславянскіх студэнтаў, якія навучаліся ў езуіцкіх акадэміях у Празе і Аламоўцы, паходзіла з беларускіх зямель.

Зусім нядаўна Антоній Васільевіч прадставіў Акадэміі навук БССР вялікі артыкул «Scorinianа», дзе разгледжаны ўсе навуковыя публікацыі пра нашага асветніка і кнігавыдаўца. Артыкул друкуецца ў юбілейным скарынінскім зборніку, які неўзабаве выйдзе ў свет.

Вельмі важнай падзеяй у сваім жыцці А. В. Флароўскі лічыў свой прыезд на Беларусь у час мінулагодніх скарынінскіх урачыстасцей.

У лістах з Прагі Антоній Васільевіч пісаў: «Што выступае на першы план — гэта ўражанні беларускія і мінскія, якіх не засланіла ўсё тое, што давялося нам убачыць і пачуць у Ленінградзе і Маскве»; «з велізарнай цікавасцю чытаю ў «Гісторыі беларускай літаратуры» раздзелы пра Броўку, Глебку, Крапіву. Літаратурнымі звесткамі я дапаўняю жывыя ўражанні ад гэтых цікавых пісьменнікаў і людзей».

А ў лісце К. К. Крапіве: «Няма наведаніе Беларусі назаўсёды замацавалася ў нашай памяці не толькі таму, што яно дало мне магчымасць далучыць і свой сціплы голас да ўдзячнага прызнання вялікіх заслуг беларускага асветніка Фр. Скарыны, але і таму, што яно ўвяло мяне ў кола жывых уражанняў ад таго творчага парыву, які ахапіў сённяшніх дзеячоў Беларусі, якія дбайна служаць вышэйшым інтарэсам свайго народа»...

А. МАЖЭЙКА.

# ПЕРШЫ ВЕРНІСАЖ

Гамяльчане атрымалі добры падарунак — адкрылася выставачная зала Гомельскага аддзялення Саюза мастакоў БССР.

У бліжэйшы час жыхары горада пазнаёмяцца з творчасцю лепшых фотамайстроў краіны, з творамі мастакоў з Бранска і сваіх калег са сталіцы рэспублікі. Але гэта — планы. А пакуль што тут паказаў свае работы малады гомельскі мастак Станіслаў Гарачаў.

Паўсотні палоцен досыць яскрава сведчаць, што жывапісец імкнецца шырока асэнсаваць рэчаіснасць. Ён шукае сваю тэматыку, сваю «мову».

Перш за ўсё вабіць рамантычная ўзнёсласць яго твораў. Яна ўласцівая і карціне «З песень грамадзянскай вайны», на якой — баец і конь, напісаныя буйным планам, кантрастнымі пунсовым і блакітным тонамі, і кампазіцыя «Першы снег», «Партрэт маці», героі якіх—людзі палымянай, нястрымнай натуры.

С. Гарачаў настойліва авалодвае майстэрствам. Ён вучыцца і ў Пятрова-Водкіна, і ў Рэрыха, і ў майстроў славутых гарадзецкіх роспісаў. Натхнёна піша помнікі старадаўняй архітэктуры.

Хвалююць пейзажы С. Гарачава, напісаныя ў час паездак на Камчатку і на Поўнач. Сярод іх вылучаюцца работы «Даліна гейзераў», «Змрок», «Пад'ельнікі».

Я не збіраюся тут сцвярджаць, што ўсё бездакорна ў творчасці С. Гарачава. Ёсць у яго і творы, невыразныя па думцы (напрыклад, «Вечар»), часам мастацкае мысленне С. Гарачава— занадта ўскладненае. Нельга не папракнуць яго і за тое, што мала ўвагі аддаў пакуль што беларускай тэматыцы, сённяшняму жыццю Гомельшчыны.

Але гэтая выстаўка С. Гарачава—толькі пачатак ягонай творчай дарогі. Многае ў яго яшчэ наперадзе.

А. ШНЫПАРКОЎ.

Гомель.

**НА ЭСТРАДЗЕ—«КАФЭ «ВЯЧЭРНІ МІНСК»**

«Кафэ «Вячэрні Мінск» — так называецца новае эстраднае прадстаўленне, прысвечанае 50-годдзю БССР (сцэнарый заслужанага артыста рэспублікі М. Зорына, рэжысёр С. Дубровін). Гэта вясёлая канцэртная праграма з удзелам Несцеркі, Паўлінкі, Лявона. Музычныя фельетоны, сатыра і гумар чаргуюцца з песнямі і танцамі. Суправаджае канцэрт інструментальны квінтэт.

Першыя паказы «Кафэ «Вячэрні Мінск», адбыліся ў палацах культуры камвольнага камбіната і трактарнага завода. Вы бачыце адзін з нумароў праграмы. Выступае выканаўца народных песень Галіна Федчык.


# СТВАРАЙЦЕ СУВЕНІРЫ!

З 15 красавіка па 1 жніўня 1968 года Міністэрства гандлю БССР сумесна з Міністэрствам мясцовай прамысловасці БССР, Міністэрствам лёгкай прамысловасці БССР, Міністэрствам прамбудматэрыялаў БССР, Міністэрствам лясной, цэлюлозна-папяровай і дрэваапрацоўчай прамысловасці БССР і Міністэрствам харчовай прамысловасці БССР

**АБ'ЯЎЛЯЮЦЬ РЭСПУБЛІКАНСКІ КОНКУРС НА ЛЕПШЫЯ ЎЗОРЫ СУВЕНІРАЎ, ПАМЯТНЫХ ПАДАРУНКАЎ, ЗНАЧКОЎ І АРЫГІНАЛЬНАГА АФАРМЛЕННЯ ЎПАКОЎКІ ТАВАРАЎ, ПРЫСВЕЧАНЫХ 50-ГОДДЗЮ БССР.**

УМОВЫ КОНКУРСУ

Асноўная задача конкурсу — стварэнне новых мастацкіх сувеніраў памятных падарункаў, значкоў і арыгінальнага афармлення ўпакоўкі для ўнаранення ў масавую вытворчасць.

У конкурсе могуць удзельнічаць прадпрыемствы, арганізацыі і асобныя грамадзяне (мастакі, народныя ўмельцы і інш.).

Сувеніры і памятныя падарункі павінны вылучацца своеасаблівасцю, захоўваць лепшыя традыцыі народнага мастацтва, адлюстроўваць нацыянальныя асаблівасці рэспублікі. Шырока павінны быць прадстаўлены сувеніры і памятныя падарункі з відамі гістарычных помнікаў і выдатных мясцін рэспублікі, з паказам дасягненняў Беларусі ў галіне народнай гаспадаркі, навукі і культуры.

Пры прадстаўленні на конкурс узораў сувеніраў і памятных падарункаў павінны ўлічвацца патрабаванні масавага тыражу і серыйнай вытворчасці, невысокі кошт, арыгінальнасць упакоўкі.

Узоры сувеніраў і памятных падарункаў падзяляюцца на наступныя групы прэміяльнай ацэнкі:

ВЫРАБЫ СА ШКЛА.
ВЫРАБЫ З ФАРФОРУ І КЕРАМІКІ.
ВЫРАБЫ З МЕТАЛУ. ПЛАСТМАС, ЗНАЧКІ.
ВЫРАБЫ СКУРГАЛАНТАРЭЙНЫЯ, ТКАНЫЯ І СТРОЧАВЫШЫТЫЯ.
ВЫРАБЫ З ДРЭВА І САЛОМКІ.
ЛЮСТЭРКІ, ШЧОТКАВЫЯ ВЫРАБЫ І ЦАЦКІ.
АЛЬБОМЫ, БЛАКНОТЫ, ЗАПІСНЫЯ КНІЖКІ.
КАНДЫТАРСКІЯ І ВІНА-ВОДАЧНЫЯ ВЫРАБЫ У ЮБІЛЕЙНЫМ АФАРМЛЕННІ.
ЮБІЛЕЙНАЯ УПАКОЎКА ДЛЯ ТАВАРАЎ НАРОДНАГА ЎЖЫТКУ.

ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

*Узоры сувеніраў і памятных падарункаў прадстаўляюцца на конкурс да 1 жніўня 1968 года па адрасу: Мінск, в. К. Маркса, 8; Беларускі філіял Павільёна лепшых узораў тавараў народнага ўжытку.*

Кожны ўдзельнік конкурсу можа прапанаваць адзін або некалькі ўзораў вырабаў і прадстаўляць іх пад дэвізам з дадатнам кароткім апісання, у якім указваецца матэрыял тэхналогія вырабу сувеніра або памятнага падарунка, яго канструкцыя. Калі неабходна, дык прыкладаюцца адпаведныя ўказанні або інструкцыі.

У закрытым канверце пад тым жа дэвізам указваюцца звесткі аб аўтары вырабу: прозвішча, імя, імя па-бацьку, адрас, год нараджэння, адукацыя, асноўная прафесія.

У выпадку, калі ўзор прапануецца калектывам аўтараў, у канверце павінны быць звесткі аб усіх аўтарах.

На ўзорах вырабаў павінен быць надпіс: «На конкурс».

*За лепшыя ўзоры вырабаў са шкла, фарфору і керамікі, скургалантарэйных, тканых, строчавышытых, металу, пластмас і значкоў устанаўліваюцца наступныя прэміі:*

ТРЫ ПЕРШЫЯ ПА 250 РУБЛЕЎ,
ТРЫ ДРУГІЯ ПА 200 РУБЛЕЎ,
ПЯЦЬ ТРЭЦІХ ПА 100 РУБЛЕЎ.

За вырабы з дрэва, саломкі, люстэркі, шчоткавыя вырабы, за цацкі, альбомы, блакноты, запісныя кніжкі, кандытарскія і віна-водачныя вырабы ў юбілейным афармленні і юбілейную ўпакоўку для тавараў народнага ўжытку ўстанаўліваюцца прэміі:

ЧАТЫРЫ ПЕРШЫЯ ПРЭМІІ ПА 200 РУБЛЕЎ,
ПЯЦЬ ДРУГІХ ПРЭМІЯ ПА 100 РУБЛЕЎ,
ДЗЕСЯЦЬ ТРЭЦІХ ПРЭМІЯ ПА 75 РУБЛЕЎ.
ЗААХВОЧВАЛЬНЫЯ ПРЭМІІ НА АГУЛЬНУЮ СУММУ 1000 РУБЛЕЎ.

(Заахвочвальныя прэміі ад 30 да 50 рублёў прысуджаюцца журы паводле яго меркавання).

Прэміраваныя вырабы паступаюць ва ўласнасць Беларускага філіяла Павільёна лепшых узораў тавараў народнага ўжытку і могуць быць выкарыстаны згодна з яго меркаваннямі. Не прэміраваныя вырабы могуць быць запатрабаваны аўтарамі на працягу двух месяцаў пасля рашэння журы.

Дадатковая інфармацыя па тэлефонах: 22-54-43, 22-55-37.

МІНІСТЭРСТВА ГАНДЛЮ БССР.


# МАСТАЦТВА на тым баку

## СА СМЕТНІКА... НА ПАЛАТНО

Аднойчы мастак Уолтэр Мэрч, праходжваючыся па вуліцах Нью-Йорка, выпадкова зайшоў у невялікі антыкварны магазін і ўбачыў там на паліцы забальзамаваную галаву сабакі. Чамусьці яна зрабіла на яго вялікае ўражанне, і праз некалькі гадоў ён усё яшчэ памятаў аб ёй. І неяк адважыўся зноў заглянуць у гэты магазін і купіў гэтую галаву, хоць яе цяпер ужо добра паела моль. У сваёй студыі ён паклаў пакупку побач з сухой японскай хурмой і галоўкамі цыбулі, разбітым грамафонам і іржавым метраномам, непрыгодным карбюратарам і старым радыятарам ад аўтамабіля, побач з кучай усялякіх адкідаў, дзе можна было знайсці малаткі, пінцэты, шыла і іншыя рэчы, якія аджылі свой век.

— Можа гэты дзівак з тых, што захапляецца пошукамі і зборам самых незвычайных рэчаў? —спытае недасведчаны чытач.

На гэты раз не так проста. Як піша амерыканскі часопіс «Ньюсуік», уся гэтая утыльсыравіна Мэрча «знайшла сваю дарогу ў яго карціны, дзе яна набывае новае і нечаканае значэнне».

Часопіс падрабязна расказвае пра выстаўку Мэрча ў Брукліскім музеі ў Нью-Йорку, дзе прадстаўлена 70 яго карцін і малюнкаў.

Кожны з гэтых «твораў» выклікае ў «мастацтвазнаўцы» з Ньюсуіка» захапленне: «Мэрч абыходзіцца з гэтымі непатрэбнымі рэчамі з такой глыбокай пашанай,— піша ён, — што, здаецца, быць адкідамі — гэта ганарова».

Далей, больш... Самыя гучныя эпітэты, самыя высокія ацэнкі. І, «вялікае майстэрства», і «звычайнае становішча незвычайным, абломкі становяцца пёсам, а старызна магічным чынам ператвараецца ў багацце...»

Між іншым, сам Мэрч гаворыць аб сваёй задачы больш сціпла: «Мяне хвалююць забытыя рэчы, якія людзі выкідваюць пасля таго, як да канца выкарыстаюць іх».

Мэта, што і казаць, вельмі сціплая. Але пры чым тут мастацтва?

## ГІГАНЦКАЯ... ПУСТАТА

«У лесе сучасных стыляў Хельд стварыў арыгінальную і дынамічную форму абстрактнага мастацтва. Яго карціны гнятуць масіўнасцю і яркасцю», — так амерыканскі часопіс «Ньюсуік» ацэньвае выстаўку работ амерыканца Хельда, нядаўна паказаную ў сценах мастацкага музея Сан-Францыска. Дырэктар гэтага музея Нордленд, які прыклаў нямала намаганняў, каб арганізаваць гэтую выстаўку, гаворыць пра Хельда: «Ён —адзін з найбольш незалежных мастакоў. Ён сказаў новае слова, яго жывапіс — гэта новы эксперымент».

Калі мы вышэй сказалі, што дырэктару музея ў Сан-Францыска Нордленду спатрэбілася патрацціць нямала сіл і энергіі для паказу гэтай выстаўкі, дык мелі на ўвазе не нейкія там цяжкасці, скажам, у пошуках і зборы карцін Хельда. Зусім не. Гаворка ідзе перш за ўсё аб тым, што адміністрацыя музея доўга круціла галаву над тым, як размясціць у залах творы Хельда, бо, як заявіў Нордленд, «упершыню ў выяўленчым мастацтве з'явіліся танія памеры».

Што ж, памеры «твораў» Хельда сапраўды незвычайныя, яны, бадай, не маюць сабе роўных. Так, напрыклад, карціна пад назвай «Грэчаскі сад» выканана на палатне, якое мае параметры 3,6 м× 17 м. Другая — «Круг і трохвугольнік» крыху меншая—3,6 м Х 8,5 м. Самая маленькая карціна «Вуглы» — мае памер, праўда, усяго адзін метр на метр дваццаць сантыметраў. Але апошняя работа — гэта выключэнне з агульнага правіла.

Здзіўленыя маштабамі палотнаў, наведвальнікі сан-францыскага музея хутка, літаральна на ходу, прыдумалі ім свае назвы. І прытым даволі трапныя: «дарожныя завалы», «дахі», «вялікія сцены». Да гэтага часу, каменціруе дырэктар музея Нордленд, мы бачылі танія маштабы толькі ў афішах.

Але, можа, звышгіганцкія палотны нясуць што-небудзь новае па сутнасці? На жаль, як гэта можна меркаваць па прыведзеных вышэй назвах, нічога арыгінальнага ў іх няма. Карціна «Грэчаскі сад» уяўляе сабой размешчаныя побач адзін з адным, па адной прамой вялікіх памераў круг, куб і трохвугольнік, выкананыя ў яркіх танах. Наведвальнік, спыніўшыся перад гэтымі геаметрычнымі фігурамі, адчувае сябе няёмка, няўтульна і адзінока.

Між іншым, калі меркаваць па заяве самога аўтара, дык якраз гэтага ён і дамагаўся. «Я хачу, — гаварыў ён карэспандэнту часопіса «Ньюсуік», — каб мае карціны дзейнічалі на вас таксама, як шафёр, які наехаў на вас. Я хачу, каб яны вас прыціснулі і прымусілі вас азірнуцца вакол, каб устанавіць, дзе вы знаходзіцеся».

Што ж, здаецца, мэта, пастаўленая аўтарам, дасягнута.

Г. НАВІЦКІ.


*Рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» патрэбна машыністка, якая добра ведае беларускую мову.*

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 00689.